Пралетарыі ўсіх краеў, злучайцеся!

פראלעטאריער פון אלע לענדער, פאראייניקט זיך!

Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

ТЭЛЕФОНЫ: Адказн. рэдактара 7-69; Адказн. сакратара 4-78; Сэктароў 6-15; Начная рэдакцыя 12-65 (два званка); Выдавецтва 2-44.

УМОВЫ ПАДПІСКІ: 1 месяц 1 руб.; 3 " 3 "; 6 " 6 ". Падпіска прымаецца выключна на поште і лістаносцамі. Рукапісы не зьвяртаюцца.

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР. XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

НЯДЗЕЛЯ 3 красавіка 1932 г. № 75 (3464)

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ 1 радка нонпарэлі 1 руб. КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ аб зьбе і дакуманту—2р.

СЕНЬНЯ Ў НУМАРЫ

Пастанова Савету Народных Камісараў СССР, Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) і Наркамзему СССР аб рабоце жывёлагадоўчых саўгасаў (1-я стар.).
Пастанова аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб правядзеньні веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі 1932 году (2 стар.).
Бібліяграфія: Супроць кандраць еўшчыны і нац-дэмакратызму ў пытаньнях севазваротаў (2 стар.).
Супроць скажэньня палітыкі партыі ў калгасным будаўніцтве (1 ст.).
Вышэй сьцягі барацьбы за першынства ў спаборніцтве (3 стар.).
Аб адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле Койданаўскага раёну. (Пастанова ЦВК і СНК БССР) (4 стар.).
Аб стане Беларускай арганізацыі камсамолу. (Пастанова ЦК УсеЛКСМ) (4 стар.).
Па прыкладу перадавых падцягваюцца адстаючыя (3 стар.).
Да пытаньня аб прызыве ў Чырвоную армію (4 стар.).
За граніцай.

Аб рабоце жывёлагадоўчых саўгасаў

Пастанова Савету Народных Камісараў СССР, Цэнтральнага Камітэту ЎсеКП(б) і Наркамзему СССР

I.

За апошнія два гады ў сыстэме Нар камзему створана вялізарная сетка жывёлагадоўчых саўгасаў, а іменна: арганізавана 1.480 саўгасаў з пагалоўем у 2½ млн. галоў буйнай рагатай жывёлы, 860 тыс. сьвіней і 4,7 млн. галоў авечак. Гэты размах разгортваньня жывёлагадоўчых саўгасаў патрабаваў з боку дырэктароў саўгасаў, саюзных аб'яднаньняў і абласных трэстаў належнай арганізацыі працы ў саўгасах і правільнай унутранай іх пабудовы. Між тым, абсьледваньне саўгасаў камісіямі ЦК і ЦКК паказала дрэннае кіраўніцтва работай жывёлагадоўчых саўгасаў з боку Жывёлаводаб'яднаньня, Сьвінаводаб'яднаньня, Маслааб'яднаньня, Малакоаб'яднаньня РСФСР і Птушкатрэстаў РСФСР і УССР і кіраўнікоў абласнымі трэстамі і дырэктароў саўгасаў.

Абсьледваньне ўстанавіла наступныя буйнейшыя недахопы ў рабоце саўгасаў:

а) безгаспадарчасьць і поўную неналаджанасьць працэсаў вытворчасьці;

б) зусім нездавальняючую арганізацыю догляду за жывёлай, надзвычайна вялікі падзеж маладняка, вялікі процант ялавасьці, зусім недастатковы рост стада за кошт уласнага прыплоду і дрэнны стан стада;

в) разбазарваньне таварнай прадукцыі, самазабесьпячэньне і невыкананьне плянаў здачы дзяржаве;

г) выключна слабую арганізацыю працы;

д) поўную адсутнасьць гаспадарчага разьліку і вельмі нездавальняючую пастаноўку справаздачнасьці ў саўгасах перад вышэйшымі органамі.

Савет Народных Камісараў СССР, Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і Наркамзем СССР лічаць недапушчальнымі і шкоднымі спробы асобных работнікаў жывёлагадоўчых саўгасаў і аб'яднаньняў замазаць гэтыя асноўныя недахопы ў рабоце саўгасаў, якія выцякаюць з дрэннага кіраўніцтва іх работай, спасыланьнямі на тое, што жывёлагадоўчыя саўгасы знаходзяцца ў пачатковай стадыі будаўніцтва.

Савет Народных Камісараў СССР, Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і Наркамзем СССР пастанаўляюць прызнаць нездавальняючай работу Сьвінаводаб'яднаньня, Жывёлаводаб'яднаньня, Малакоаб'яднаньня РСФСР, Птушкатрэстаў РСФСР і УССР і іх абласных трэстаў.

Савет Народных Камісараў СССР, Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і Наркамзем СССР папярэджваюць Кіраўніцтва Жывёлааб'яднаньня і, у прыватнасьці, яго старшыню т. Грушэўскага, Кіраўніцтва Сьвінаводаб'яднаньня і, у прыватнасьці, яго старшыню тав. Харламава, Кіраўніцтва Малакоаб'яднаньня РСФСР і ў асаблівасьці Кіраўніцтвы Птушкатрэстаў РСФСР і УССР, што калі яны не даб'юцца сур'ёзнага палепшаньня ў рабоце і ня зьнішчаць адзначаныя буйнейшыя недахопы ў рабоце саўгасаў, дык у адносінах да іх будуць прыняты суровыя меры спагнаньня.

Савет Народных Камісараў СССР, Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і Наркамзем СССР цалкам ухваляюць ужытыя органамі Наркамзему СССР і мясцовымі партыйнымі і савецкімі органамі меры па ліквідацыі гэтых недахопаў, якія выразіліся ў зьняцьці з работы і адданьні пад суд дырэктароў жывёлагадоўчых саўгасаў за безгаспадарчасьць і разбазарваньне дзяржаўнай таварнай прадукцыі.

Савет Народных Камісараў СССР, ЦК УсеКП(б) і Наркамзем СССР лічаць неабходным давесьці да ведама савецкай грамадзкасьці сьпіс гэтых дырэктароў.

1. Па Сьвінаводаб'яднаньні:

а) **Зьняты з работы з аддачай пад суд:** Заходняя Сібір—**Катурскі**—саўгас «Травапольле», УССР—**Сітнік**—саўгас «Комсомолец», БССР—**Скубакоў**—саўгас «Беліца», Уральская вобласьць—**Філімонаў**—саўгас «Заря», Заходняя вобласьць—**Дземінчук**—саўгас «Добрунь».

б) **Зьняты з работы без аддачы пад суд:** Заходняя вобласьць—**Люкаў**—Аньненскі саўгас, **Бражыліс**—саўгас «Всходы», Маскоўская вобласьць—**Сьлінкоў**—саўгас Зімінскі, **Банкаў**—саўгас Сасоўскі, ЦЧО—**Кастамараў**—саўгас «Прогресс», Украіна—**Ткачэнка**—саўгас імя Розы Люксэмбург, Ніжняя Волга—**Антанішкіс**—саўгас імя Нансена, Сярэдняя Волга—**Ісанкаў**—саўгас «Октябрьская Революция», Заходняя Сібір—**Худзякоў** — Лузінскі саўгас; Уральская вобласьць—**Ляпін**—Тамакульскі саўгас, **Братцаў**—саўгас «Четкарино», **Годзін**—саўгас «Заря», **Кулакоў**—саўгас «Кургая», Заходняя Сібір—**Зайцаў**—Машкоўскі саўгас, Казакстан—**Кульценка**—саўгас № 641, Татрэспубліка—**Дзягцяроў**—саўгас «Нарты», Паўночны Каўказ—**Жукоўскі**—саўгас «Ударник».

2. Па Жывёлаводаб'яднаньні:

а) **ЗЬНЯТЫ З РАБОТЫ З АДДАЧАЙ ПАД СУД:** Паўночны Каўказ—**Пузанаў**—Завецінскі саўгас, Казакстан—**Курміс**—Прыуральскі саўгас, **Байгудаў**—Арала-Цюбінскі саўгас.

б) **ЗЬНЯТЫ З РАБОТЫ БЕЗ АДДАЧЫ ПАД СУД:** Паўночны Каўказ—**Аброкаў**—Кабардзінскі саўгас, **Чычэнаў**—Балкарскі саўгас, **Слогада**—Армавірскі саўгас, **Немцаяка**—Каменскі саўгас, Украіна—**Лангут**—Чаплінскі саўгас, Сярэдняя Волга—**Іванаў**—саўгас Соль-Ілецкі, **Ізмайлаў**—Орскі саўгас, **Пажыткаў**—саўгас «Молодая Гвардия», **Цуканаў**—саўгас «Коминтерн», **Грыгор'еў**—Першамайскі саўгас, **Чардакоў**—Стаўропальскі саўгас; Ніжняя Волга—**Драговіч**—саўгас Чэрнышэўскі, Башкірыя—**Марпуль** — Алагузоўскі саўгас, **Грабоўскі**—Іняксі саўгас, **Клетончык**—Суванікскі саўгас; Уральская вобласьць—**Какорын**—Макроўсаўскі саўгас, **Калашнікаў**—саўгас Ташказган; Кіргізія—**Каняеў**—саўгас «Каинды»; Сярэдняя Азія—**Кочын**—Аламедзінскі саўгас, **Ігнаценка**—саўгас «Ирису», **Суконкін**—саўгас «Далдыбулак», **Фадзееў**—саўгас «Шамои», **Шаданаў**—саўгас—«Сайвон», **Лекшын**—саўгас «Дангара»; Казакстан—**Вялікасельцаў** — саўгас імя Ісаева, **Рэхін**—саўгас Тайпакскі, **Джаманцаў**—саўгас Кзыл-Кзінскі, **Шчукіна**—саўгас Байгунус, **Захараў**—саўгас Акцябрскі,—Карчмен саўгас Чакат **Мешчаракаў** — саўгас імя Валадарскага, **Літвінцаў**—саўгас Маржанокульскі, **Чубук**—саўгас Узенкульскі, **Вараб'ёў**—саўгас Балакткульскі; Усходняя Сібір—**Шарба**—саўгас імя Лазо, **Арбузоў**—саўгас імя Ал. Завадзкага.

3. Па Маслааб'яднаньні:

а) **ЗЬНЯТЫ З РАБОТЫ З АДДАЧАЙ ПАД СУД:** Паўночны Каўказ—**Парамонаў**—саўгас № 5, **Розанаў**—саўгас «Северная ферма № 7»; Заходняя Сібір—**Бобелеў**—саўгас № 51; Закаўказьзе—**Мухтараў** — Акбабінскі, **Маханько**—саўгас Лысагорскі, **Дыянова**—саўгас Шамахінскі, ЦЧО—**Ерохін**—саўгас Талоўскі, Пімен—саўгас «Степной», **Прохараў**—саўгас Качаржынскі.

б) **ЗЬНЯТЫ З РАБОТЫ БЕЗ АДДАЧЫ ПАД СУД:** Паўночны Каўказ—**Зорын**—саўгас № 2, Заходняя Сібір—**Белан**—саўгас № 46, **Карпуноў**—саўгас Еланскі; Закаўказьзе—**Бушкенек**—саўгас Чармагільскі.

4 Па Авечкааб'яднаньні:

а) **ЗЬНЯТЫ З РАБОТЫ З АДДАЧАЙ ПАД СУД:** ЦЧО—**Марчукоў**—саўгас імя Сталіна; Казакстан—**Сакалоў**—Бурмінскі саўгас, Украіна—**Старасьцін**—саўгас «Вольны», Крым—**Судравін**—саўгас «Тогайлы», **Труеўцаў**—саўгас «Кирк Ищунь».

б) **ЗЬНЯТЫ З РАБОТЫ БЕЗ АДДАЧЫ ПАД СУД:** Кіргізія— **Пахоменка**—саўгас Кочкарка, Паўночны Каўказ—**Стальмакоў**—саўгас № 3, Казакстан—**Дзянісаў**—Акцюбінскі саўгас, **Шаронаў**—саўгас «Таз—Булак», **Тасымаў**—саўгас «Кзыл-Аскерский», **Князеў**—Атбасарскі саўгас, Уральская вобласьць—**Багачоў**—саўгас «Бреды»; Кіргізія—**Дудко**—саўгас «Ильич»; ЗСФСР—**Садыхоў**—саўгас «Мингечуар».

5. Па Птушкааб'яднаньні РСФСР:

а) **ЗЬНЯТЫ З РАБОТЫ З АДДАЧАЙ ПАД СУД:** ЦЧО—**Бутаў**—саўгас «Красный Октябрь, **Ляпкоўскі**—саўгас Кінякоўскі, **Ванаг**—саўгас «Степное Гнездо», Іванаўская вобласьць—**Васілеў**—саўгас «Пахарь», Паўночны Каўказ—**Вестфаль**—саўгас «Гигант», **Зянкоў**—саўгас Ейскі, Заходняя Сібір—**Гамбар'ян**—саўгас № 81; Сярэдняя Волга— **Тэльвоў**—саўгас «Марат»; Ніжняя Волга—**Яфімаў—саўгас Цераўшанскі**; Маскоўская вобласьць—**Юлюшын**—саўгас «Птичное»; Заходняя вобласьць—**Масен**—саўгас «Еменец».

б) **ЗЬНЯТЫ З РАБОТЫ БЕЗ АДДАЧЫ ПАД СУД:** Заходняя вобласьць— **Кір'янаў**—саўгас «Белаводка»; Маскоўская вобласьць—**Барысаў**—саўгас «Соболиный», ЦЧО—**Андрэенка**—саўгас Аржэнка, **Лебедзеў**—Бясонаўскі саўгас, **Богінаў**—Прохараўскі саўгас, **Васільеў**—Барысаглебскі саўгас; Кіргізія—**Кісялёў**—саўгас Першамайскі; Кабардзіна-Балкарская вобласьць—**Баянаў**—саўгас Кургужын; Паўночны Каўказ—**Папоў**—саўгас—Лобінскі, **Калесьнікаў**—Кубанскі саўгас, **Мельнікаў**—Новаомскі саўгас № 80; Крым—**Гаўрылаў**—саўгас «Залесьсе».

6 Па Малакоаб'яднаньні РСФСР:

а) **ЗЬНЯТЫ З РАБОТЫ З АДДАЧАЙ ПАД СУД:** Заходняя вобласьць—**Лахматаў** саўгас «Эдо», **Канашкін**—саўгас «Талешкино».

б) **ЗЬНЯТЫ З РАБОТЫ БЯЗ АДДАЧЫ ПАД СУД:** Заходняя вобласьць—**Дэмін**—саўгас імя Фрунзе, **Эвін**—саўгас «Андрейково», — **Барсукоў**—саўгас Цярэніна, **Столбаў**—саўгас Хоцькава, Іванаўская вобласьць—**Курыгін**—саўгас Белікава, **Хрэнаў**—саўгас Тытан, **Барадулін**—саўгас «Красногорка», **Сьпірыдонаў**—саўгас імя Фрунзе, Ніжагародзкі край—**Іваноў**—саўгас імя Калініна, **Цьвяткоў**—саўгас Іваноўскі, **Баранаў**—саўгас Бароўскі, Ленінградзкая вобласьць—**Кірэеў**—саўгас «Гостилицы», **Карэль**—саўгас «Пролетарский Труд»; Маскоўская вобласьць—**Рабцаў**—саўгас «Клепики», **Рабаў**—саўгас «Паново», **Кельт**—саўгас «Пятилетка», **Анікееў** саўгас Юр'ева

Савет Народных Камісараў СССР, ЦК УсеКП(б) і Наркамзем СССР падкрэсьліваюць, што ў выніку адзначаных вышэй безгаспадарчасьці, разбазарваньня дзяржаўнага дабра і розных іншых злачыннасьцяй плян здачы мяса для гарадоў аказаўся выкананым жывёлагадоўчымі саўгасамі ў 1931 годзе толькі на 69 проц., **чым была нанесена вялізарная страта справе забесьпячэньня рабочых, забесьпячэньня арміі і іншых працоўных у гарадох.**

II.

У адпаведнасьці з тым, што галоўнай задачай ў галіне будаўніцтва жывёлагадоўчых саўгасаў у 1932 г. зьяўляецца поўнае выкананьне пляну здачы імі мяса, масла і воўны—**Савет Народных Камісараў СССР, Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) і Наркамзем СССР пастанаўляюць:**

1. Вызначыць на 1932 год гадавы плян здачы:

а) **па Жывёлаводу:** мяса 1.500.600 пудоў і масла 610.000 пудоў;

б) **па Сьвінаводу:** мяса—3.660.000 пудоў;

в) **па Маслааб'яднаньні:** мяса — 326.411 пудоў і масла—640.500 пудоў;

г) **па Авечкааб'яднаньні:** мяса — 1.129.781 пуд і воўны—773.000 пудоў.

2. Камплектаваньне як старых, так і новых жывёлагадоўчых саўгасаў буйнай рагатай жывёлай і сьвіньнямі за кошт Саюзмяса спыніць з тым, каб у далейшым рост стада саўгасаў ішоў за кошт уласнага прыплоду

Пакінуць у выглядзе выключэньня, з прычыны асаблівай важнасьці павялічэньня таварнай прадукцыі воўны і з прычыны таго, што саўгасы Авечкааб'яднаньня параўнальна больш здавальняюча асвоілі вытворчасьць, камплектаваньне Авечкааб'яднаньня авечкамі за кошт Саюзмяса ў 1932 годзе, абмежаваўшы разьмеры гэтага камплектаваньня 1,8 мільёнаў галоў. Камплектаваньне Маслааб'яднаньня ў раёнах экспартнага масларобства вызначыць у колькасьці 78.000 кароў.

3. Адмовіцца ад арганізацыі зімовага апаросу ў саўгасах Сьвінаводаб'яднаньня на бліжэйшыя 2 гады, за выключэньнем паўднёвых раёнаў УССР, Паўночнага Каўказу і Закаўказьзя.

4. Абмежаваць у 1932 годзе будаўніцтва новых саўгасаў па Сьвінагодаб'яднаньні 20 саўгасамі (у раёнах мясакамбінатаў), па Маслааб'яднаньні 22 саўгасамі (у раёнах экспартнага масларобства) і па Авечкааб'яднаньні 16 саўгасамі (ня лічачы тых новых саўгасаў, якія будуць створаны ў выніку разузбуйненьня зараз існуючых саўгасаў-гігантаў).

5. Даручыць Наркамзему СССР правесьці ў далейшым наступны парадак будаўніцтва і прыёмкі новых саўгасаў, а іменна: камплектаваньне саўгасаў жывёлай праводзіцца толькі пасьля сканчэньня ўсяго будаўніцтва, прычым прыёмка адбудаваных саўгасаў павінна праводзіцца спэцыяльнымі прыёмачнымі камісіямі ў тым-жа парадку у якім праводзіцца прыёмка новых прадпрыемстваў у прамысловасьці.

6. Даручыць Наркамзему СССР правесьці разузбуйненьне існуючых саўгасаў і трэстаў, устанавіўшы:

а) межны разьмер саўгасаў па Жывёлаводаб'яднаньні, у залежнасьці ад умоў раёну, ня вышэй 3—8 тысяч галоў;

б) межны разьмер саўгасу па Маслааб'яднаньні, у залежнасьці ад умоў раёну, ня вышэй 1.000 кароў, фэрмы саўгасу ў 200—400 кароў;

в) межны разьмер саўгасу па Авечкааб'яднаньні па грубашэрстных авечках ня вышэй 50.000 галоў, па племянных авечках ня вышэй 10.000 галоў;

г) межны разьмер саўгасу па сьвінаводаб'яднаньні: для спажывецкай паласы, БССР, ЗСФСР—400 сьвіноматак, для УССР і ЦЧО—700 сьвіноматак, для астатніх раёнаў—1.000 сьвіноматак; разьмер сьвінафэрмы вызначыць ў 100—150 сьвіноматак.

7. Зацьвердзіць мерапрыемствы, якія праводзяцца Наркамземам СССР па арганізацыі ў кожным жывёлагадоўчым саўгасе фэрмаў з замацаваньнем за ротам стада, г. зн. маючых сталы матачны оклад, поўную праграму вырошчваньня стада, здачы прадукцыі, а таксама мерапрыемствы, якія праводзяцца Наркамземам па згуртаваньні ў цэнтральнай сядзібе саўгасу кіраўніцтва машынна-трактарнай базай, арганізацыяй палеводства, снабжэньнем кармамі і кантролю за ўсёй работай фэрмы.

8. Даручыць Наркамзему СССР пры скарыстаньні асыгнаваных на капітальнае будаўніцтва ў жывёлагадоўчых саўгасах сродкаў забясьпечыць у першую чаргу ва ўсіх арганізаваных у 1931 годзе і разузбуйнёных саўгасаў поўнасьцю арганізацыю водазабясьпячэньня, жыльля для сталага кадру рабочых і спэцыялістаў і будаўніцтва цёплых памяшканьняў для ўсяго маладняка, у тым ліку прыплоду вясны 1933 г.

9. Даручыць Наркамзему СССР **закончыць рэарганізацыю жывёлагадоўчых саўгасаў і трэстаў да 1 чэрвеня 1932 г.**

10. Для арганізацыі справы снабжэньня рабочых, служачых і спэцыялістаў жывёлагадоўчых саўгасаў **арганізаваць у складзе Цэнтрасаюзу на правах асобнай сэкцыі спажывецкую каапэрацыю жывёлагадоўчых саўгасаў, аналёгічную транспартнай.**

III.

Савет Народных Камісараў СССР, Цэнтральны камітэт УсеКП(б) і Наркамзем СССР адзначаюць, што з боку НКЗему СССР і яго мясцовых органаў ня было дастатковага кантролю за работай жывёлагадоўчых саўгасаў, трэстаў і аб'яднаньняў, ня было забясьпечана дастатковае штодзённае кіраўніцтва арганізацыяй вытворчасьці ў жывёлагадоўчых саўгасах. З прычыны гэтага:

1. Даручыць НКЗему СССР узмацніць штодзённы кантроль і кіраўніцтва ўсёй сыстэмай жывёлагадоўчых саўгасаў, іх трэстаў і аб'яднаньняў.

2. Даручыць Наркамзему СССР прызначыць у кожны жывёлагадоўчы саўгас кантралёра Наркамзему СССР з тымі-ж правамі, што і ў зернясаўгасах.

Савет Народных Камісараў СССР, Цэнтральны камітэт УсеКП(б) і Наркамзем СССР таксама адзначаюць, што кантроль за работай і дапамога жывёлагадоўчым саўгасам з боку краёвых партыйных савецкіх органаў да гэтага часу зусім недастатковы: Савет Народных Камісараў СССР і Цэнтральны камітэт УсеКП(б) звярочваюць увагу ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый на тое, што жывёлагадоўчыя саўгасы, як новая цяжкая справа, патрабуюць штодзённай дапамогі і кантролю з боку мясцовых партыйных і савецкіх органаў.

Старшыня СНК СССР В. Молатаў (Скрабін)

Сакратар ЦК УсеКП(б) І. Сталін

Наркамзем СССР Я. Якаўлеў.

ЗА ГРАНІЦАЙ

Японія дае пазыку манчжурскаму ўраду

ТОКІЕ. 2-IV. Агенцтва Сімбун Рэнга паведамляе, што рада міністраў сёньня абгаварвала просьбу манчжурскага ўраду аб прадстаўленьні пазыкі на суму ў 20 млн. іен тэрмінам на 5 год. Рада міністраў прыйшла да заключэньня, што японскі ўрад ня можа задаволіць гэтую просьбу, з прычыны таго, што манчжурскі ўрад яшчэ не прызнаны Японіяй, але японскі ўрад ня можа пакінуць манчжурскі ўрад ў цяжкім становішчы, таму вынесена рашэньне прапанаваць Паўднёва - Манчжурскай чыгунцы, усходняму каленізацыйнаму таварыству і Чэсэн банку (усе тры прадпрыемствы зьяўляюцца мешанымі прадпрыемствамі і кіруюцца урадам) прадставіць пазыку манчжурскаму ураду.

„Расьпісаньне“ ці „тэрмін“...

Японія не сьпяшаецца з вывадам войск з Кітаю

ШАНХАЙ. 1-IV. Англійская газэта «Норд Чайна Дэйлі Ньюс» паведамляе, паводле вестак з пэўных крыніц, аб наступных выніках шанхайскіх перагавораў:

1. На паседжаньні ваеннай падкамісіі кітайцы згадзіліся на адвод японскага войска ў раёны 4-х пунктаў, але адмовіліся задаволіць японскае патрабаваньне аб стварэньні зоны вакол станцыі Чэнжу.

2. Японцы згадзіліся на вызначэньне тэрміну адводу войска да пунктаў, прылягаючых да Шанхаю, але рашуча адмовіліся вызначыць пэўны срок поўнага вываду японскага войска з кітайскай тэрыторыі ў Японію ці ў межы сэтльмэнту.

Японцы зазначаюць, што перад поўным вывадам японскага войска павінна адбыцца японо-кітайская канфэрэнцыя для вырашэньня палітычных пытаньняў, якія выцякаюць з адносін паміж паасобнымі краінамі.

Кітайцы ў сваю чаргу заяўляюць, што абгаварэньне палітычных праблем павінна праходзіць пасьля вываду японскага войска.

3. Кітайскае войска застаецца на ранейшых пазіцыях.

4. Японцы ўсяляк супярэчаць проці ўжываньня выразу «тэрмін» таму, прынята рашэньне ўжываць выраз «расьпісаньне» вываду японскага войска. Японскія афіцэры зазначаюць, што японскае войска пачне эвакуацыю на працягу тыдню.

Француска-японская дружба ўмацняецца

ТОКІЕ. 1-4. Сюды прыбыў дырэктар «Франка-японскага банку» Мартэні, які вядзе тут перагаворы аб фінансавым супрацоўніцтве Францыі з Японіяй.

У японскіх эканамічных колах зазначаюць, што «Франка-японскі банк», які аказаў у мінулым рад паслуг Японіі, разьмяшчаючы ўсе пазыкі Японіі, прапануе пашырыць сваю дзейнасьць у гэтым напрамку.

Тэрор супроць кампартыі Нямеччыны ўзмацняецца

БЭРЛІН. II-IV. У другім туры выбараў у прэзыдэнты фігуруюць 3 кандыдаты—Гіндэнбург, Гітлер от капіталістаў і тав. **Тэльман—ад рабочае клясы.** Буржуазія ўзмоцнена рыхтуецца да другога туру, Яшчэ да скачэньня тэрміну так званага «грамадзянскага міру», які быў накіраваны выключна супроць рабочае клясы, новыя «надзвычайныя» распараджэньні следуюць адно за адным.

Сацыял-дэмакратычны начальнік паліцыі Гржэзінскі ўчора забараніў прадастаўляць у распараджэньне кампартыі залі, дзе павінны адбывацца склікаемыя на 8 і 19 красавіка масавыя мітынгі супроць вайны, голаду і фашызму. Сацыял-дэмакратычны начальнік паліцыі забараніў таксама правядзеньне эстафэты чырвоных спортсмэнаў у гонар **Тэльмана.**

Учора Гржэзінскі выдаў новае распараджэньне, якім устанаўляецца папярэдняя цэнзура таксама для ўсіх спэцыяльных выданьняў газэты «Ротэ фанэ».

Міністр унутраных спраў бруніцкага ўраду Грэнер на падставе надзвычайнага дэкрэту забараніў кіно-фільм «Кюле-Вампэ», створаны калектывам пралетарскіх работнікаў мастацтва. Забарона матывуецца тым, што фільм зьяўляецца «пагрозай грамадзкай безапаснасьці».

Пад ботам румынскіх баяр

Зьдзекі, катаваньні, катаржныя прыгаворы, расстрэлы ахапілі ўсю Бэсарабію

ВЕНА I-IV. Як паведамляюць з Бухарэста скончыўся пачаты 8 сакавіка працэс 48 рэвалюцыйных рабочых і сялян Паўднёвай Бэсарабіі, якія абвінавачваліся ў спробе арганізаваць паўстаньне ў Бэсарабіі. 7 абвінавачаных прыгавораны да 10 год катаргі кожны, 6 да 8 год і 28 да 7 год. Гэты працэс зьяўляецца толькі паасобным зьвяном цэлага ланцугу самага жорсткага тэрору, накіраванага супроць рэвалюцыйных рабочых і сялян.

Толькі нядаўна, 28 лютага, у Ясах 26 бэсарабскіх маладых рабочых былі прыгавораны на розныя тэрміны да 4-х год катаржных работ. У Аргееве (горад Бэсарабіі) былі праведзены павальныя вобыскі і арышты сярод рабочых. У Клужы сярод арыштаваных былі 14 гадовыя хлопчыкі і дзяўчынкі. У Цімішэры арыштаваныя 15 маладых рабочых падпалі ў засьценках сігуранцы такім зьверскім зьдзекам, што іх прышлося ўсіх перавесьці ў шпіталь.

З польскай рэчаіснасьці

Эндэцкая газэта «Дзеньнік Віленскі», зьмяшчаючы гэтую карыкатуру, зазначае: Цяпер беспрацоўе і голад ахапілі ўсю краіну—«СЬВЯТКУЮЦЬ ЗА ПУСТЫМ СТАЛОМ».

Беспрацоўныя атакавалі Варшаўскі магістрат

Рабочыя, іх жонкі і дзеці пад капытамі паліцэйскіх коняй

Бранявікі і пажарныя насосы дзейнічаюць

ВАРШАВА. 1-4. У цэнтры Варшавы, на Тэатральным пляцу разыграліся ўчора ўвечары поўныя драматызму сцэны. Каля 1000 рабочых, занятых у апошнія часы на грамадзкіх работах, арганізаваных магістратам, пазбавіліся з прычыны спыненьня гэтых работ апошняга кавалку хлеба і прыбылі з сваімі жонкамі і дзецьмі да будынку магістрату. Увесь пляц і частка прылягаючых вуліц былі запруджаны дэманстрантамі. Пешая паліцыя аказалася ня ў стане разагнаць сабраўшыхся. Частка дэманстрантаў аказала паліцыі супраціўленьне. Некалькі паліцэйскіх зьбіты. Выбіты шыбы ў некаторых суседніх дамох.

Некалькі сот чалавек у тым ліку шмат жанчын і дзяцей паляглі на рэйкі трамваеў і на брук, цалкам паралізаваўшы рух. Прыбыўшы атрад коннай паліцыі пачаў таптаць ляжаўшых на зямлі дэманстрантаў. У ход былі пушчаны нават спэцыяльныя бранявікі, пажарныя насосы, якія аблівалі вадой рабочых. Сутычка працягвалася больш гадзіны. Толькі па прыбыцьці новых падмацаваньняў паліцыі ўдалося разагнаць дэманстрантаў.

Сярод беспрацоўных распаўсюджвалася вялікая колькасьць камуністычных адозваў. Паліцыя арыштавала звыш 20 чалавек.

Турма ў полымі

ПАРЫЖ. 31-III. Як паведамляюць з Мадрыду, у Малазе (Гішпанія) у турме выбухнуў бунт сярод палітвязьняў, арыштаваных у сувязі з нядаўнімі рэвалюцыйнымі выступленьнямі бастуючых, а таксама сярод «11 зьняволеных чужаземцаў».

Зьняволеныя падпалілі нары і ўзброіўшыся рэвальвэрамі і нажамі абяззброілі варту. Прыбыўшая паліцыя не магла прабіцца ў турму з прычыны пагрозы зьняволеных расправіцца с усімі заложнікамі-турэмшчыкамі. Паліцыя заняла ўсе турэмныя ўваходы. Уся турма ахоплена полымем.

Справа правакатара Штэрна будзе разглядацца 4 красавіка

МАСКВА. Справа па абвінавачаньні ШТЭРНА і ВАСІЛЬЕВА ў замаху на саветніка нямецкага пасольства г. Фон-ТВАРДОЎСКАГА сьледзтвам скончана і назначаецца да слуханьня на 4 красавіка, а 10 гадзіне раніцы ў вайсковай калегіі Вярхоўнага суда пад старшынствам тав. УЛЬРЫХА В. В.

Дзяржаўнае абвінавачаньне будзе падтрымліваць тав. КРЫЛЕНКА Н. З.

Супроць скажэньня палітыкі партыі ў калгасным будаўніцтве

Барысаўскі раён у палоне апартунізму

Барысаў. (Наш спэцкор.). Махровыя «лявацкія» загібы робяцца пад бокам барысаўскіх раённых арганізацый і ні райвыканкам ні райком партыі не рэагуюць належным чынам на гэтыя ганебныя зьявішчы. Больш таго, 30 сакавіка—праз некалькі дзён пасьля паяўленьня ў друку пастановы ЦК УсеКП(б) ад 26-га сакавіка—бюро райкому прымае пастанову, якая намячае рад мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да трэцяй бальшавіцкай сяўбы, і ні адным словам не абмаўляецца аб канкрэтных носьбітах «лявацкіх» загібаў, якія ёсьць у калгасных і саўгасных ячэйках Барысаўскага раёну.

На справе пастанова ЦК ад 26-га сакавіка па раённай арганізацыі не рэалізуецца. Вынікі гэтага—у раёне бачны. Падамо некалькі фактаў.

У калгасе «Савецкая Каменка», Зембінскага сельсавету, ніякай работы па растлумачэньні пастановы ЦК аб прымусовым абагуленьні жывёлы не праводзіцца. Замест абгаварэньня гэтай пастановы сакратар партячэйкі даў дырэктыву старшыні калгасу «абагуліць усю рагатую жывёлу і папярэдзіў, што ў выпадку неабагуленьня ці няпоўнага абагуленьня старшыня калгасу будзе выключаны з радоў партыі.

Ажыцьцяўляючы заданьне сакратара ячэйкі, старшыня калгасу загнаў усе каровы калгасьнікаў у агульны калгасны хлеў і ніякія пратэсты з боку калгасьнікаў не змаглі пераканаць ні сакратара ячэйкі, ні кіраўніка калгасу ў іх няправільным дзеяньні.

З калгасу «Вызваленьне працы», Метчанскага сельсавету па ініцыятыве ўпаўнаважанага райкому партыі тав. Новікава выключаны тры калгасьніні за нежаданьне абагуліць свае апошнія каровы.

Старшыня Зембінскага сельсавету Дудзіцкі даў цьвёрдае заданьне сям'і чырвонаармейца Жукоўскага і за невыкананьне гэтага заданьня гаспадарка Жукоўскага была аштрафавана на 225 руб. Гэта справа была перадана ў народны суд, які адмовіўся разглядаць яе з прычыны адсутнасьці падстаў, а за час вядзеньня справы Дудзіцкі забраў у Жукоўскіх апошнюю карову.

На сям'ю чырвонаармейца Касьцюковіча К. таксама дадзена цьвёрдае заданьне. Такі-ж лёс выпаў і на сям'ю чырвонаармейца Рамаечука М. Бядняк Конан Сямён, які мае толькі адну карову атрымаў таксама цьвёрдае заданьне.

Барысаўскі райкалгассаюз парашыў увесьці заработную плату ў калгасах. У калгасе «Маяк сацыялізму» (прыгагадны) пры садзейнічаньні раённых арганізацый на працягу 6-8 месяцаў калгасьнікі атрымлівалі заработную плату 1-га і 15-га чысла кожнага месяца. Прычым былі ўстаноўлены 7 разрадаў, на якія былі падзелены ўсе калгасьнікі. У выніку такой «формы работы» калгасьнікі запазычыліся ў калгасе ад 500 да 700 рублёў кожны.

Характэрна тое, што калгас «Маяк сацыялізму», які амаль поўнасьцю падрыхтаваўся да трэцяй бальшавіцкай вясны, ня можа прыступіць да яе правядзеньня толькі... з-за адсутнасьці рабочай сілы. І ня дзіўна, бо ў гэты «калгас» на словах, сучаснага старшыні тав. Сьвідэля, рабочая сіла раней прысылалася з біржы працы.

Побач з «лявацкімі» загібамі ў раёне ёсьць шмат фактаў праяўленьня махровага правага апартунізму.

У Метчанскім сельсавеце кулакі і падкулачнікі на вачох кіраўнікоў партячэйкі і сельсавету драпежніцкі забіваюць і разбазарваюць жывёлу.

У Зембінскім сельсавеце былы ўласьнік воўначоскі Касьцюковіч ня выконвае дадзеныя яму цьвёрдыя заданьні па здачы пянькі, а між тым члены сельсавету добра ведаюць, што Касьцюковіч схаваў сваю пяньку. Ваганцэвіч Алена, якая сыстэматычна наймае рабочых для апрацоўкі і продажы лёну, не атрымала цьвёрдага заданьня. Больш гэтага, сельсавет нават прэміраваў ботінкамі і маслам вядомага кулака—Шышпаронка.

Цэнтральнай задачай на даным этапе зьяўляецца арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў і на яе падставе далейшае разгортваньне калектывізацыі. Гэтая задача недаацэньваецца раённымі работнікамі. Яскравы прыклад недаацэнкі гэтага пытаньня паказвае наступнае:

У вёсцы Вагі арганізаваўся калгас «Бальшавік» з 20-ці беднацка-серадняцкіх гаспадарак. Калгас распаўся праз некаторы час з прычыны адсутнасьці дапамогі з боку належных арганізацый.

Калгасы засьмечаны. З 150 калгасаў, якія ёсьць у раёне, 33 налічваюць ад 3 да 11 гаспадарак. Ёсьць калгасы, якія састаяць выключна з заможных гаспадарак. У калгасе «Ударнік», Зембінскага сельсавету з 30 гаспадарак—8 індывідуальна абкладзены.

У выніку слабай работы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў паасобныя калгасьнікі пакідаюць калгасы. Раённыя работнікі замест барацьбы з гэтым зьявішчам аб'ектыўна памагаюць развальваньню іх.

Калі да загадчыка Барысаўскага райзба тав. Глуха зьвярнуўся калгасьнік з заявай аб тым, што яго выключылі з калгасу з-за асабістых рахункаў толькі таму, што на чале калгасу стаяць заможна-кулацкія элемэнты, т. Глух супакойна паклаў гэтую заяву пад сукно, кажучы: «добра, мы яе пашлем у сельсавет для выясненьня».

**

Раён дрэнна падрыхтаваўся да сяўбы. Насенныя фонды сабраны на паперы на 60 проц., а на справе і таго менш. Ёсьць выпадкі разбазарваньня ўжо засыпанага насеньня. Інвэнтар не адрамантаваны. Машына-трактарныя станцыі да вясны не падрыхтаваліся. Вытворчыя пляны ня складзены. Сталыя брыгады не арганізаваны.

Аднаасобнаму сэктару, які складае 70 проц. гаспадарак раёну, ня толькі не дапамагаюць у падрыхтоўцы да трэцяй калгаснай вясны, але яўна яго ігнаруюць. Памяткі на самаабавязацельствы (па сяўбе) не даведзены да кожнай бядняцка-серадняцкай гаспадаркі. Не даведзены і цьвёрдыя заданьні па сяўбе да кулацкіх гаспадарак, за выключэньнем Лошніцкага, К. Слабодзкага і Жыцькаўскага с.-с., якія пэўную работу ў гэтых адносінах правялі.

Раённым кіруючым арганізацыям вядомы гэтыя ганебныя справы, але да сёньняшняга дня ня мабілізавана пралетарская грамадзкасьць на барацьбу за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і ўраду.

ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове ад 26-га сакавіка ясна гаворыць: **«Спыніць усякія спробы прымусовага аграмаджваньня кароў і дробнай жывёлы ў калгасьнікаў, а вінаватых у парушэньні дырэктыў ЦК выключыць з партыі».**

Барысаўскія раённыя арганізацыі не разумеюць і ня хочуць разумець вялікага значэньня пастановы Цэнтральнага Камітэту, яны апынуліся ў апартуністычным балоце.

А. Левін.

В. Закрэўскі.

Лінейная калібровочная мішень LRT-BE4-V2

ПАСТАНОВА АБ'ЯДНАНАГА ПЛЕНУМУ ЦК і ЦКК КП(б)Б

аб правядзеньні веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі 1932 году

XVII партканфэрэнцыя паставіла цэнтральнай задачай у галіне сельска-гаспадарчай вытворчасьці ў 1932 г. і другой пяцігодцы рашучае павышэньне ўраджайнасьці калгасных і саўгасных палёў і барацьбу за высокую прадукцыйнасьць сельскай гаспадаркі. Пры гэтым «задачы арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і сацыялістычнага перавыхаваньня калгасных мас павінны стаяць ў цэнтры ўвагі і ў другой пяцігодцы» (XVII партканфэрэнцыя).

Трэцяя бальшавіцкая вясна павінна прайсьці пад знакам барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за агра-тэхніку, укараненьне севазваротаў, за высокую якасьць апрацоўкі глебы, барацьбы са стратамі, узорнай арганізацыі уборкі, што зьяўляецца складанай часткай арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і якаснага павышэньня калгаснай вытворчасьці.

Асноўнымі асаблівасьцямі вясновай сяўбы г. г. зьяўляюцца: рашаючыя перамогі партыі, дасягнутыя ў галіне індустрыялізацыі краіны, ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, у выніку чаго калгасы і саўгасы займаюць пераважнае месца ў сельска-гаспадарчай вытворчасьці; у час вясновай сяўбы на калгасных палёх БССР будзе працаваць 57 МТС з трактарным паркам у 18400 HP. Далей ідзе абвастрэньне клясавай барацьбы, якое выклікаецца разгорнутым сацыялістычным наступам па ўсіх франтох будаўніцтва і супраціўленьнем гэтаму наступу аджываючых і ліквідуемых капіталістычных элемэнтаў, якія ўжываюць новыя формы і мэтады барацьбы супроць мерапрыемстваў партыі і ўлады.

Барацьба за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў зьяўляецца барацьбой за ўмацаваньне сельска-гаспадарчай арцелі. Рашаючае значэньне ў барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў мае арганізацыя працы на аснове брыгаднага мэтаду, як лепшай формы, што забясьпечвае максымальную прадукцыйнасьць працы, ліквідацыю ўраўнілаўкі і абязьлічкі.

1. На 20-III па рэспубліцы засыпана: насенфондаў—64,19 проц., у тым ліку тэхнічных—46,3 проц., страхфондаў у калгасах—52,9 проц., у аднаасобнікаў—11,2 проц. Такое становішча тлумачыцца тым, што з боку раду раённых арганізацый не падхоплена і не ўзначалена ініцыятыва калгасьнікаў па арганізацыі міжраённай і міжкалгаснай узаемадапамогі, рэалізацыі насеннай пазыкі і г. д.

2. Рамонт па ўсіх с-г сыстэмах выкананы: па трактарах на 69,9 проц., трактарных плугох на 64,7 проц., конных плугох на 61 проц., сеялках—на 70,5 проц., вазох на 41,6 пр. Маецца значнае адставаньне ў прасоўваньні сельска- гаспадарчых машын са складаў і будаўніцтва нафтахавальнікаў, пры чым загрузка наяўных нафтахавальнікаў праходзіць яўна нездавальняюча.

3. Давядзеньне плянаў вясновай сяўбы да калгасаў і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у парадку самаабвязацельстваў ня скончана.

Ня поўнасьцю дадзены цьвёрдыя заданьні па сяўбе кулацка-заможным гаспадаркам. Дрэннае апэрацыйнае кіраўніцтва з боку трэстаў і раённых арганізацый саўгасамі ў падрыхтоўцы да сяўбы. Зусім нездавальняючы ход падрыхтоўкі да веснавой сяўбы ў аднаасобным сэктары.

4. Пленум ЦК і ЦКК адзначае асабліва нездавальняючае правядзеньне мерапрыемстваў па ўздыму ўраджайнасьці і ўкараненьні агратэхнікі. У радзе раёнаў існуе палітычная недаацэнка мерапрыемстваў па ўздыму ўраджайнасьці і ўкараненьні агратэхнікі (вывазка ваны, ачыстка насеньня, збор попелу, завоз мінэральнага ўгнаеньня і інш. мерапрыемствы марудна выконваюцца).

5. Пленум асабліва падкрэсьлівае нездавальняючую падрыхтоўку да сяўбы і амаль адсутнасьць сапраўднага павароту да практычнай арганізацыі калгаснай вытворчасьці ў наступных раёнах: Дрысенскім, Расонскім, Барысаўскім, Церахаўскім, Лельчыцкім, Парыцкім, Петрыкаўскім, Гомельскім, Бягомльскім, Лагойскім і Пухавіцкім.

6. У радзе раёнаў не даецца рашучага адпору кулацкай агітацыі за разбазарваньне коняй і фуражных фондаў. Ня створаны належныя фуражныя фонды і не разгорнута ўзаемадапамога па кармавых рэсурсах на час правядзеньня сяўбы і эканомія ў выдаткаваньні іх.

7. Плян падрыхтоўкі кадраў масавай кваліфікацыі выкананы толькі на 40 проц., у тым ліку па трактарыстах-рулявых—58 проц., брыгадзірах і па ільёне і канаплях на 14,4 проц. Па раёнах: Бешанковіцкім, Глускім, Жыткавіцкім, Лоеўскім, Плешчаніцкім, Прапойскім, Сіроцінскім, Смалявіцкім, Церахаўскім і Чэрыкаўскім—падрыхтоўка кадраў да вясновай сяўбы зусім сарвана. З боку сельска-гаспадарчых трэстаў ня прынята неабходных захадаў да сваячасовага правядзеньня арганізаванага набору рабсілы ў саўгасах, укараненьня зьдзельшчыны, рэформы зарплаты і арганізацыі працы на аснове шасьці умоў т. Сталіна.

8. Прафсаюзы (асабліва сельска-гаспадарчыя), камсамол і шэфскія арганізацыі нездавальняюча разгарнулі работу па падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі.

Слаба разгорнута масавая работа і канкрэтнае, апэрацыйнае кіраўніцтва ходам падрыхтоўкі да пасеўкампаніі асабліва справай арганізацыі працы на аснове шасьці паказаньняў т. Сталіна, як з боку цэнтральных, так і раённых савецкіх і зямельна-калгасных органаў і партарганізацый. Партыйныя, савецкія і зямельна-калгасныя арганізацыі ў большасьці раёнаў БССР не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з пастановамі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, не ўзяліся па сапраўдному за выкананьне гэтых пастаноў, не перанесьлі цэнтру цяжару падрыхтоўкі да пасеўкампаніі на арганізацыю брыгад—асноўнага зьвяна калгаснай вытворчасьці, не мабілізавалі мас рабочых саўгасаў, МТС і калгасьнікаў і не забясьпечылі ўтварэньня брыгад па вытворчым прынцыпе, а ў накаторых раёнах (у прыватнасьці: у Смалявіцкім і Талачынскім) фармальна падыйшлі да арганізацыі калгасных брыгад, ня вызначыўшы за брыгадамі сталага складу калгасьнікаў, не замацаваўшы сталага зямельнага вучастку, інвэнтара, рабочай жывёлы, насеньня і фуражу.

Да гэтага часу зусім недастаткова разгорнута работа па вылучэньні і выхаваньні калгаснага актыву.

Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б прызнае становішча з падрыхтоўкай да сяўбы і ход выкананьня дырэктыў аб арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў нездавальняючым і паказвае, што падрыхтоўка і правядзеньне 3-й бальшавіцкай сяўбы зьяўляецца зараз асноўнай важнейшай задачай усёй КП(б)Б, якая (задача) зьвязана з выкананьнем пляну 4-га заключнага году пяцігодкі.

ПЛЕНУМ ЦК і ЦКК КП(б)Б—ПРАПАНУЕ:

1. Партыйным, савецкім і зямельна-калгасным арганізацыям безадкладна прыступіць на справе да арганізацыі вытворчых брыгад, з сталым складам калгасьнікаў, прымацаваўшы да іх пэўныя вучасткі, сельска- гаспадарчы інвэнтар, цягавую сілу і выдзеліўшы адпаведна з вытворчым плянам брыгады патрэбную колькасьць насеньня, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на падбор і вылучэньне брыгадзіраў са склада ударнікаў-калгасьнікаў, вядучы барацьбу супроць цякучасьці іх склада. Павысіць палітычную і гаспадарчую кваліфікацыю брыгадзіраў. Разгарнуць работу вытворчых нарад у калгасах.

Пленум прызнае становішча кіраўніцтва калгаснай вытворчасьцю як з боку цэнтру раёнамі, так раёнаў непасрэдна калгасамі, не адпавядаючым сучасным патрабаваньням і даручае Бюро ЦК распрацаваць мерапрыемствы па ўмацаваньні кіраўніцтва ў гэтай галіне.

Пленум абавязвае партыйныя і савецкія арганізацыі забясьпечыць арганізаванае правядзеньне адыходніцтва з калгасаў і рашучую барацьбу з самацёкам у гэтай справе, даручыўшы Бюро ЦК на бліжэйшым пасяджэньні распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па гэтым пытаньні.

Пленум прапануе партарганізацыям разгарнуць рашучую барацьбу з самацёкам у калгасным руху з тым, каб на аснове арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, завяршыць суцэльную калектывізацыю БССР у 1932—33 г.

Пленум прапануе партарганізацыям разгарнуць работу па выхаваньні і вылучэньні калгаснага актыву (курсы, канфэрэнцыі і рад інш. мерапрыемстваў), на які неабходна абапірацца пры правядзеньні ўсіх мерапрыемстваў па веснавой сяўбе.

2. Скончыць стварэньне насенных і страхавых фондаў да 10-га красавіка шырока разгарнуўшы барацьбу за насеньне, за арганізацыю міжраённай і міжкалгаснай узаемадапамогі, за рэалізацыю насеннай пазыкі, арганізацыю буксірных брыгад, усямерна заахвочваючы ініцыятыву калгасьнікаў у гэтай справе. Пленум папярэджвае, што стварэньне насенных і страхавых фондаў зьяўляецца асноўнай задачай падрыхтоўкі да сяўбы, ад пасьпяховага выкананьня якой будзе залежыць выкананьне плянаў сяўбы.

Разам з тым Пленум падкрэсьлівае, што абсеменьненьне намечанай плошчы павінна поўнасьцю праходзіць за лік мабілізацыі ўнутраных насенных рэсурсаў. Неабходна рашуча змагацца са спажывецкімі настроямі, якія выяўляюцца ў імкненьні зьменшыць пасевы вядучых культур за лік спажывецкіх культур.

Пленум расцэньвае размовы аб нерэальнасьці пасеўных плянаў, якія ёсьць у асобных раёнах, як простую барацьбу супроць плянаў і нежаданьне мабілізаваць масы на іх выкананьне. Павінна быць разгорнута самая бязьлітасная барацьба з імкненьнямі скараціць пляны, асабліва за лік тэхнічных культур і асваеньня новых зямель, з самацёкам у мабілізацыі другагарадных культур.

Пленум абавязвае Райкомы неадкладна выконваць нарады Наркамзему на перакідку насеньня.

3. Рамонт трактароў і с-г машын, збор тары і рамонт, загрузку усёй наяўнай тары гаручым скончыць да 10-га красавіка. Узьняць адказнасьць майстэрань за якасьць іх рамонту. Ад ступені адрамантаванасьці трактароў, падрыхтаванасьці каня і поўнай ліквідацыі абязьлічкі будзе залежаць вырашэньне карэннага пытаньня ці здолее саўгас, калгас і МТС, пасьпяхова змагацца за высокі ўраджай, ці здолее засеяць палі ў самы кароткі тэрмін. У дэкадны тэрмін прасунуць усе с-г машыны і інвэнтар, якія ёсьць на складах у саўгасы і калгасы.

4. Пленум абавязвае ўсе партыйныя, калгасныя і зямельныя арганізацыі павесьці рашучую барацьбу з палітычнай недаацэнкай мерапрыемстваў па ўздыме ўраджайнасьці і ўкараненьні агратэхнікі, паставіць ў цэнтры ўвагі работу, зьвязаную з мерапрыемствамі па ўздыме ўраджайнасьці (зерняачыстка і пратручваньне насеньня, вапнаваньне і тарфаваньне глебы, сваячасовая вывазка гною, завозу мінэральнага угнаеньня, збор попелу, раньняе ворыва і інш.)

Пленум завастрае асаблівую ўвагу ўсіх партарганізацый на абавязковае правядзеньне раньняй сяўбы, якая павінна быць скончана ў максымальна-скарочаны тэрмін (на працягу мая мес.), што мае вельмі важнае значэньне ў справе барацьбы за падвышэньне ўраджайнасьці.

На аснове правядзеньня ўсіх гэтых мерапрыемстваў у разьмерах, вызначаных пастановай ЦК і СНК БССР,—дабіцца ураджайнасьці з га ня меньш 2,6 цэнт, па лёна-валакну, 4 цнтн. па канопля-валакну, 112 цнтн. па гародных культурах, па канюшынавым сене 35 цнтн., па вікавым сене—33 цнтн., па зярнёвых культурах—9 цнтн.

5. Агратэхніцы належыць выключная роля ў барацьбе за ўздым сацыялістычнай вытворчасьці на новую якасна вышэйшую ступень, што цесна зьвязана з найбольш поўным скарыстаньнем пераваг, якія дае буйнае сацыялістычнае земляробства. Задачай партарганізацый у падрыхтоўцы і правядзеньні вясновай сяўбы зьяўляецца прыняцьце самых рашучых захадаў па ўкараненьні агратэхнікі ў саўгасы, МТС і калгасы, мабілізуючы на гэтую справу шырокія масы рабочых саўгасаў, МТС, калгасьнікаў і с-г спэцыялістаў. Пленум лічыць абавязковым для ўсіх камуністых і камсамольцаў аўладаньне агра-зоатэхнікай і тэхнікай калгаснай вытворчасьці. Паставіць цэнтральнай задачай перад усімі сельска-гаспадарчымі, навукова-дасьледчымі ўстановамі ўкараненьне ў шырокія масы рабочых саўгасаў, МТС і калгасьнікаў агратэхнікі і абавязаць Дзяржвыдавецтва пашырыць выданьне папулярнай навукова-агратэхнічнай літаратуры, плякатаў і лістовак.

Пленум абавязвае ўсе партыйныя і савецкія арганізацыі забясьпечыць найбольш уважлівыя адносіны да с-г спэцыялістаў, рашуча змагацца з недаацэнкай і ігнараваньнем іх ролі. Неабходна вызваліць сельска-гаспадарчых спэцыялістаў ад усялякай канцылярскай работы, не дапускаць іх выкарыстоўваньня не па спэцыяльнасьці, выкарыстоўваючы іх непасрэдна у с-г вытворчасьці. С-г спэцыялісты павінны быць у першых радох барацьбітоў за высокі ўраджай, за ўкараненьне агратэхнікі.

6. Пленум указвае ўсім партарганізацыям на тое, што ў 1932 г. павінна быць створана ўласная кармавая база для разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Пасьпяховасьць стварэньня гэтай базы цалкам залежыць ад поўнага выкананьня плянаў вяснавой сяўбы і падрыхтаванасьці да ўборачнай кампаніі. Пленум абавязвае партыйныя арганізацыі забясьпечыць поўнае выкананьне плянаў засеву кармавых траў, сіласаваньня і ўстанавіць самае жорсткае выдаткаваньне кармоў.

7. Пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б абавязвае ўсе партыйныя, савецкія і калгасныя арганізацыі забясьпечыць няўхільнае выкананьне наступнай пастановы ЦК УсеКП(б) ад 26-га сакавіка.

«У радзе раёнаў назіраецца практыка абагуленьня кароў і дробнае жывёлы у паасобных калгасьнікаў фактычна прымусовымі спосабамі, што самым грубым чынам парушае неаднаразовыя ўказаньні Цэнтральнага камітэту партыі і статут сельска-гаспадарчай арцелі. Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) з ўсёй рашучасьцю падкрэсьлівае, што толькі ворагі калгасаў могуць дапускаць прымусовае абагуленьне кароў і дробнае жывёлы ў паасобных калгасьнікаў. Цэнтральны Камітэт растлумачвае, што практыка прымусовага адбіраньня ў калгасьнікаў кароў і дробнае жывёлы ня мае нічога агульнага з палітыкай партыі. Задача партыі заключаецца ў тым, каб у кожнага калгасьніка была свая карова, дробная жывёла, птушка. Далейшае пашырэньне і разьвіцьцё калгасных фэрм павінна ісьці толькі шляхам вырошчваньня фэрмамі маладняка, або куплі імі жывёлы. Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) прапануе ўсім партыйным, савецкім і калгасным арганізацыям:

а) Спыніць усякія спробы прымусовага абагуленьня кароў і дробнае жывёлы ў калгасьнікаў, а вінаватых у парушэньні дырэктывы ЦК выключаць з партыі;

б) арганізаваць дапамогу і садзейнічаньне калгасьнікам ня маючым каровы, або дробнае жывёлы, у куплі і вырошчваньні маладняка для асабістых патрэб».

Пленум даручае Бюро ЦК і Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б у дэкадны тэрмін распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па ажыцьцяўленьні данай пастановы ЦК УсеКП(б).

8. У мэтах стварэньня насенных фондаў, Пленум ЦК і ЦКК абавязвае НКЗ, ГК і РК пры правядзеньні веснавой сяўбы 1932 году забясьпечыць поўнае абсемяненьне плошчы пад насеньнікамі бабовых, зернявых і кармовых культур.

9. У веснавой сяўбе МТС павінна паставіць у цэнтры сваёй увагі барацьбу за якасьць сельска-гаспадарчай вытворчасьці і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Работу МТС партыя будзе ацэньваць па выніках ураджайнасьці і павышэньні таварнасьці калгасаў, якія імі абслугоўваюцца, па выкананьні гэтымі калгасамі ўсіх сваіх абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай. Выходзячы з гэтага, партарганізацыі павінны забясьпечыць павышэньне арганізацыйна-вытворчай ролі МТС і адказнасьці за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Неабходна шырока разгарнуць і ўзьняць на палітычную вышыню дагаворную кампанію МТС з калгасамі, якая да гэтага часу ў радзе раёнаў праходзіць фармальна, без належнай увагі з боку партыйных і савецкіх арганізацый і бяз удзелу шырокіх калгасных мас.

10. Пленум завастрае ўвагу партыйных, савецкіх і зямельна-калгасных арганізацый на правядзеньне рашучай барацьбы з недаацэнкай ролі аднаасобнага сэктару. Неабходна ўзмацніць работу па падрыхтоўцы да сяўбы аднаасобнага сэктару, дабіцца выкананьня імі вытворчых плянаў, правядзеньня агра мерапрыемстваў, поўнага выкарыстаньня ўсіх унутраных матар'яльных рэсурсаў у пэрыяд пасеўнай кампаніі. Прычым гэта павінна праводзіцца на аснове шырока разгорнутай масавай растлумачальнай работы, якая павінна быць наблізжана да мас аднаасобнікаў (вылучэньне агітатараў, канфэрэнцыі, сходы, і інш.).

11. Пленум прапануе прафсаюзам, камсамолу і шэфскім арганізацыям прыняць практычна непасрэдны ўдзел у падрыхтоўцы да сяўбы. Прафсаюзы павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на сваячасовую падрыхтоўку і забясьпечаньне сяўбы ў прыгарадных гаспадарках.

12. Адзначаючы вялізарную важнасьць шэфства рабочых над вёскай, Пленум ЦК і ЦКК прапануе фракцыі ЦСПСБ перабудаваць работу шэфтаварыстваў з тым, каб на працягу бліжэйшага часу ў галіне шэфства ўвагу накіраваць:

а) на прыняцьце актыўнага ўдзелу ў арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньні калгасаў, перанясеньні лепшага вопыту (арганізацыі працы, замацаваньне вытворчай брыгады, ліквідацыі абязьлічкі);

б) на дапамогу ў забясьпечаньні і правядзеньні плянаў веснавой сяўбы і мерапрыемстваў па павышэньні ўраджайнасьці;

в) на культурна-палітычнае выхаваньне шырокіх калгасных мас у сьвядомых будаўнікоў калгаснай гаспадаркі.

13. Пасеў 40 тыс. га каапэрацыйнымі прыгараднымі гаспадаркамі зьяўляецца важнейшай крыніцай па палепшаньні рабочага снабжэньня. Аднак, Пленум адзначае, што ход падрыхтоўкі да сяўбы ў капгасах, асабліва па раньніх культурах, пагражае зрывам. Пленум ЦК і ЦКК абавязвае Белкаапсаюз, ГК і РК неадкладна стварыць рашучы пералом у падрыхтоўцы да сяўбы ў капгасах з тым, каб забясьпечыць сваячасовы завоз насеньня, угнаеньня і вывазку гною. Поўнае выкананьне плянаў сяўбы ў капгасах зьяўляецца адной з асноўных гаспадарча-палітычных задач партарганізацыі.

14. Абавязаць партыйныя арганізацыі, цэнтральныя і раённыя ўстановы зрабіць рашучы пералом у падрыхтоўцы кадраў да веснавой сяўбы, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на падрыхтоўку трактарыстаў, брыгадзіраў, ільнаводаў, кармавікоў, скарыстаўшы на іх падрыхтоўку мабілізаваных спэцыялістаў цэнтральных устаноў і студэнтаў. Пленум падкрэсьлівае, што ад падрыхтоўкі кадраў, асабліва брыгадзіраў і трактарыстаў, у значнай ступені будзе залежыць выкананьне пастаўленых задач 3-й бальшавіцкай вясны.

15. Правядзеньне ўсёй работы па веснавой сяўбе павінна быць шчыльна ўвязана з падрыхтоўкай да правядзеньня кантрактацыі, асабліва вядучых культур (лён, бульба, гародніна) з тым, каб заключэньне контрактацыйных дагавароў праходзіла з удзелам шырокіх мас калгасьнікаў і было скончана да выхаду на палявыя работы.

Абавязаць РК КП(б)Б не пазьней як у пяцідзённы тэрмін давесьці пляны кантрактацыі да калгасаў і сельсаветаў.

16. Наяўнасьць 332 саўгасаў з пасеўнай плошчай—240 тыс. га патрабуе выключнай увагі і палепшаньня кіраўніцтва саўгасамі з боку саўгасных трэстаў і раённых арганізацый. Саўгасы ў веснавой сяўбе павінны стаць авангардам у барацьбе за высокі ўраджай, за новую сацыялістычную культуру земляробства. Да пачатку сяўбы неабходна скончыць заключэньне дагавароў паміж саўгасамі і калгасамі на неабходную рабочую сілу для саўгасаў, сапраўды перавесьці ўсе работы ў саўгасах на зьдзельшчыну, дабіцца ажыцьцяўленьня шасьці умоў т. Сталіна ў саўгасах, шырока практыкаваць узаемадапамогу паміж саўгасамі і калгасамі ў час палявых работ.

17. Надаючы вялізарнае значэньне правільнаму і сваячасоваму фінансаваньню веснавой сяўбы і крэдытаваньню сельскай гаспадаркі. Пленум даручае НКФ, беларускай канторы Дзяржбанку, НКЗ, Калгасцэнтру і ўсім РК прыняць меры да поўнага і эфэктыўнага скарыстаньня крэдытаў сельскай гаспадаркі, рашуча не дапускаючы пры гэтым ураўнілаўкі, выкарыстоўваньня на спажывецкія патрэбы і распыленьня крэдытаў.

18. Пленум падкрэсьлівае, што работа партарганізацыі ільнаводных раёнаў павінна ацэньвацца ў залежнасьці ад сваячасовага і поўнага выкананьня імі плянаў сяўбы, павышэньня ўраджайнасьці, уборкі і апрацоўкі вядучай культуры—лёну, а работа жывёлагадоўчых раёнаў будзе ацэньвацца выходзячы з таго, наколькі яны здолеюць забясьпечыць стварэньне магутнай кармовай базы і карэннае павышэньне прадукцыйнасьці жывёлагадоўлі ўжо ў 1932 г. У вырашэньні апошняй задачы мае асаблівае значэньне злучная кампанія, апаросная і ацёлачная, на якія павінна быць зьвернута значная ўвага партаргонізацый.

Пленум прапануе партарганізацыям арганізаваць выкананьне плянаў веснавой сяўбы, шляхам разгортваньня шырокай масавай работы, у прыватнасьці значна пасіліць работу сярод працоўных жанчын праз дэлегацкія сходы, палітасьветныя ўстановы і інш.

19. Цэнтральны, раённы і нізавы друк павінен стаць ініцыятарам у ўжываньні агра-тэхнікі на саўгасных і калгасных палёх. Праз друк партарганізацыі павінны узьняць шырокія масы рабочых саўгасаў, МСТ, калгасьнікаў, беднякоў, серадмякоў—аднаасобнікаў на барацьбу за высокі ўраджай, за мабілізацыю насеньня, рамонт інвэнтара, падрыхтоўку цягавай сілы і правядзеньне інш. мерапрыемстваў, за падрыхтоўку уборкі ўраджаю.

Побач з выяўленьнем недахопаў у рабоце па падрыхтоўцы і правядзеньню веснавой сяўбы ў раёне, сельсавеце, саўгасе, МТС, калгасе неабходна шырока асьвятляць лепшы вопыт работы, пераносячы гэты вопыт на ўсе саўгасы, калгасы, МТС, сельсаветы. Шырока разгарнуць заключэньне сац. дагавароў паміж асобнымі раёнамі, калгасамі, МТС і саўгасамі.

20. Поўнае і правільнае скарыстаньне жаночай рабсілы ў калгасах магчыма пры дастатковым разгортваньні бытавых устаноў (дзіц. пляцоўкі, яслі). У сувязі з гэтым Пленум абавязвае НК аховы здароўя, Наркамасьветы, ГК і РК забясьпечыць не пазьней 5-V разгортваньне вызначанай сеткі дзіцячых пляцовак, ясьляў і інш. бытавых устаноў.

Разам з тым Пленум ЦК і ЦКК абавязвае Белкаапсаюз, саўгастрэсты і Белкалгасцэнтр разгарнуць работу па арганізацыі грамадзкага харчаваньня на час пасеўнай кампаніі.

21. Усім саўгасам, МТС, калгасам, раённым арганізацыям прыступіць да правядзеньня з 1- га красавіка па 15-е красавіка генэральнай праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы, правяраючы ня толькі колькасную падрыхтаванасьць, але і якасную, агледзець кожную машыну, яе спраўнасьць, рашуча выкрываючы очкаўціральцтва. Праверка павінна мабілізаваць шырокія калгасныя масы на барацьбу за якасьць, за раньняе сканчэньне сяўбы, з тым, каб арганізавана выйсьці у поле, раней сяўбу кончыць і вызваліць хутчэй людзкія і цягавыя рэсурсы на выкананьне другіх важнейшых работ, з тым, каб завярбаваць сотні тысяч ударнікаў 3-й бальшавіцкай вясны. Праверка, праведзеная масамі, павінна яшчэ больш павысіць палітычную і вытворчую актыўнасьць рабочых саўгасаў, МТС і калгасьнікаў, шчыльней згуртаваць іх вакол партыі і пад яе кіраўніцтвам дабіцца пераможнага завяршэньня вяснавой сяўбы, забясьпечыўшы высокі ўраджай.

22. Пленум падкрэсьлівае, што апэрацыйнае кіраўніцтва сяўбой можа быць забясьпечана толькі пры ўмове рашучай перабудовы і ўмацаваньня партыйна-масавай работы ў вёсцы.

Пленум прапануе ГК і РК безадкладна ўмацаваць нізавую парт. ячэйку ў МТС, саўгасах, калгасах, прадпрыемствах і вёсках перабудаваць работу апорных ячэек, забясьпечыўшы інструктаваньне і жывую дапамогу нізавой ячэйкі з боку ГК, РК і апорных ячэек, правільна расставіць камуністаў, удзяліўшы асаблівую ўвагу ўмацаваньню партыйнага ўплыву на ўсіх важнейшых і рашаючых вучастках сельска-гаспадарчай вытворчасьці (фэрме, скотным двары, сьвінарніку, калгасных брыгадах, трактарнай калёне і г. д.).

Важнейшай задачай ўсіх партарганізацый ў вёсцы зьяўляецца падвышэньне арганізатарскай і кіруючай ролі камуністых і камсамольцаў, якія павінны пагалоўна быць ударнікамі ня толькі самі, але і арганізатарамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод рабочых МТС, саўгасаў і калгасаў.

23. Падрыхтоўка і правядзеньне сяўбы сустракае шалёнае супраціўленьне клясавага ворага і яго агентуры ўнутры партыі. Кулацтва ўсю энэргію накіроўвае на тое, каб падарваць справу арганізацыйна - гаспадарчага замацаваньня калгасаў, стварэньня брыгад, як асноўнага зьвяна калгаснай вытворчасьці, нацкоўвае адсталых калгасьнікаў на перадавых ударнікаў-актывістых, супроць укараненьня новай тэхнікі, агратэхнікі ў калгасы. У радзе выпадкаў клясавы вораг не сустракае рашучага адпору, нават з боку партыйных арганізацый. Пленум падкрэсьлівае, што задачы трэцяй бальшавіцкай вясны могуць быць выкананы толькі ў рашучай барацьбе з клясавым ворагам, у прыватнасьці пры ўмове рашучай ачысткі калгасаў ад кулацка-варожых элемэнтаў, у барацьбе з агентурай клясавага ворага, правымі і «левымі» апартуністымі і з прымірэнцтвам да ухілаў ад лініі партыі.

Першы Усебеларускі зьлёт ударніц фінфронту

* 2-га красавіка раніцняе паседжаньне пачалося дакладам намесьнікам Наркому фінансаў БССР тав. ЛЯХАВА аб задачах, якія стаяць ў 1932 годзе ў галіне мабілізацыі сродкаў і аб удзеле ў гэтым пытаньні працоўных жанчын. «Жанчына—кажа тав. ЛЯХАЎ—павінна актыўна ўдзельнічаць ў рабоце на фінансавым фронце. Яна павінна змагацца да выкананьне і перавыкананьне фінпляну».

* Пасьля дакладу тав. Ляхава выступіла т. ЗАХАРАВА—начальнік галоўнага кіраўніцтва ашчадкасамі і дзяржкрэдыту БССР. Т. Захарава адзначыла рад дасягненьняў і недахопаў на фінфронце і спынілася на рабоце ашчадкас. «Нашы ашчалкасы яшчэ ня здолелі сапраўды павярнуцца тварам да шырокіх працоўных мас, яны яшчэ маюць рад недахопаў у сваёй рабоце. Для зьнішчэньня гэтага,—гаворыць т. Захарава—нам трэба нашу ашчадкасу пертварыць ў ашчадкасу культурную.»

* Далей тав. Захарава спынілася на той рабоце, якую павінна правесьці ў другім квартале кожная ўдарніца фінфронту: «Ударніца ня толькі павінна змагацца за выкананьне фінпляну, але і за выкананьне іншых задач, якія паставілі перад намі партыя і ўрад».

* Пасьля выступленьня тав. Захаравай разгарнуліся спрэчкі.

* З Магілёву на імя т. Хацкевіча і 1-га Ўсебеларускага зьлёту ўдарніц фінфронту паступіла тэлеграма ад рабочых фабрыкі імя тав. Куйбышава з рапартам аб выкананьні і перавыкананьні фінпляну 1-га кварталу. У заключэньні рапарту гаворыцца.. «Куйбышаўцы, ўзятыя бальшавіцкія тэмпы ў барацьбе за фінплян, ніколі не здадуць».

* Тав. ЛІТАЛЬСОН з ф-кі імя Лекерта (Віцебск) расказала зьлёту, якім чынам яны выйшлі з прарыву на фінфронце і дамагліся посьпехаў.

* Зьлёт заслухаў рапарты з РЭЧЫЦЫ, ШКЛОВУ, ЦЕРАХАЎКІ аб выкананьні імі фінпляну

* Пасланы тэлеграмы НКФ СССР т. ГРЫНЬКО і ЦП саюзу ФБР т. ЗАСЛАЎСКАМУ.

* З прывітаньнем ударніцам зьлёту выступіў нам. старшыні Калгасцэнтру тав. СТРЭЛЕ.

* На вячэрнім пасяджаньні працягваліся спрэчкі па дакладах тав. Ляхава і Захаравай.

* У заключэньне зьлёту Наркамфін БССР прэм'яваў рад ударніц фінфронту грашыма і граматамі і ўручыў ім ашчадныя кніжкі.

* Дэлегаткі зьлёту прынялі рэзалюцыю, у якой абяцаюць перад партыяй і ўрадам у 2-м квартале і надалей весьці ўдарную работу на фінфронце.

* 2 красавік ўвечары 1-ы Усебеларускі зьлёт ударніц фінфронту закрыўся.

Калгас „Расьсьвет" да сяўбы гатовы

Вузда. Дзякуючы бальшавіцкаму кіраўніцтву партячэйкі, штодзёнка паваяўному мабілізавала калгасьнікаў на падрыхтоўку да сяўбы.

Калгас «Расьсьвет», Пырошаўскага сельсавету цалкам падрыхтаваўся да вясны.

У калгасе цалкам засыпана насеньне і страхавыя фонды, ачыстка насеньня скончана, с.-г. інвэнтар адрамантаваны.

Штодзёнка і рабселькоры праводзяць масавую работу аб насенпазыцы суседнім калгасам.

Менск, ЦВК БССР

Агульны сход рабочых, спэцыялістаў і служачых саўгасу імя тав. СТАЛІНА, Койданаўскага раёну шле палкае прывітаньне і аднагалосна адабрае пастанову ЦВК БССР аб рэарганізацыі Койданаўскага раёну ў нацыянальна польскі раён і абвяшчае сябе ўдарным па ажыцьцяўленьню рашэньня.

Па даручэньню схода Старшыня РВК.

Бібліяграфія

Супроць кандрацьеўшчыны і нац-дэмакратызму ў пытаньнях севазваротаў

1. Барыс Бойка. Гаспадарчая характарыстыка севазваротаў, Менск, БДВ, 1930 г., стар. 120.
2. Праф. В. В. Вінэр. Шматпольныя севазвароты БССР, Менск, БДВ, 1930 г., стар. 48.
3. М. Цэйтлін. Арганізацыя буйнай гаспадаркі ільнянага раёну. Менск, БДВ, 1931 г., стар. 72.
4. М. А. Тарасаў. Лён. Менск, БДВ, Сельгассэктар 1932 г., стар. 56.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ў нас ленінскае пытаньне «хто каго», як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы вырашана на карысьць сацыялізму канчаткова і беспаваротна.

Партыя паставіла, як адну з асноўных задач, у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі на даным этапе арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Цэнтральнай задачай ў гэтай справе зьяўляецца барацьба за якасьць, за ўстойлівы і высокі ўраджай. Адным з асноўных мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьні гэтых задач у нашай сельскай гаспадарцы зьяўляецца агратэхніка, у прыватнасьці—севазварот. Трэба адзначыць, што калі ў пытаньнях с.-г. эканомікі кандрацьеўшчына амаль поўнасьцю выкрыта, то ў пытаньнях агратэхнікі да гэтага часу барацьба з кандрацьеўшчынай вялася недастаткова, а між тым «устаноўкі» кандрацьеўцаў у пытаньнях агратэхнікі ня меньш шкодны для нашага сацыялістычнага будаўніцтва чым у пытаньнях с.-г. эканомікі. Працягваючы барацьбу з кандрацьеўшчынай у пытаньнях с.-г. эканомікі, неабходна павесьці разгорнутую барацьбу супроць яе і ў агратэхніцы.

Як вядома, беларускія кандрацьеўцы і нацдэмы на чале з Прышчэпавым усякім чынам стараліся затрымаць шпаркія тэмпы сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі БССР, накіраваць разьвіцьцё нашай сельскай гаспадаркі не па сацыялістычным шляху. Гэтую сваю шкодніцкую лінію яны ўпарта праводзілі як у пытаньнях эканомікі, так і агратэхнікі сельскай гаспадаркі. Гэтую сваю шкодніцкую лінію яны праводзілі ў прыватнасьці і ў пытаньнях севазваротаў.

Наша неадкладная задача—выкрыць гэту кандрацьеўскую мэтадалёгію і разам з тым распрацаваць на аснове марксысцка-ленінскай тэорыі мэтадалёгію па ўкараненьні агратэхнікі ў нашы саўгасы і калгасы.

У даным выпадку мы маем на ўвазе аддаць кароткаму агляду літаратуру па пытаньнях севазваротаў, якая выйшла ў БССР за апошнія тры гады.

Кніжка Б. БОЙКА напісана на падставе матар'ялаў 1-й Усебеларускай выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці. Гэтая кніжка мела сваёй мэтай: «на падставе вынікаў працы нашых навукова-дасьледчых устаноў 1-й гаспадарчай практыкі жыцьця ў навукова-літаратурнай форме даць: *). 1. Тэхнічныя правілы будовы севазваротаў. 2. Гаспадарчыя падставы будовы севазваротаў. 3. Арганізацыйна-тэхнічную характарыстыку некалькіх варыянтаў севазваротаў, прыстасаваных да асноўных кірункаў сельскай гаспадаркі БССР пры ўмове сучаснай машыновай тэхнікі... Брашура разьлічана на падрыхтаванага чытача, саўгасьніка і калгасьніка і на мясцовага зямельнага працаўніка» (3-я старонка).

Як бачым, гэтая кніжка мела сваёй мэтай даць асноўным нашым кадрам на вёсцы па ажыцьцяўленьні дырэктыў партыі ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі арыентоўку ў мэтадах умацаваньня гэтае гаспадаркі. Але, як убачым ніжэй, з мэтадалёгічнага боку гэтая кніжка пабудавана цалкам на аснове шкодніцкай «тэорыі» Кандрацьева-Чаянава і мае яўна контр-рэвалюцыйны характар. Спынімся на некалькіх асноўных устаноўках гэтай кніжкі.

У выкананьне закранутых задач аўтар перш за ўсё павінен быў даць свайму чытачу яскравае ўяўленьне сутнасьці сацыялістычнай плянавай гаспадаркі, аб тым, што БССР зьяўляецца неадлучнай часткай адзінай плянавай гаспадаркі Саюзу, і як гэткая, павінна выконваць тыя народна-гаспадарчыя функцыі, якія ўскладаюцца на яе Саюзам у парадку сацыялістычнага падзелу працы.

Аўтар павінен быў далей, яскрава паказаць чытачу, што пасьпяховае выкананьне закранутых у прыватнасьці і ім самім задач, як часткі пяцігадовага пляну сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі рэспублікі (аб якім між іншым аўтар ні слова не сказаў у сваёй кніжцы) магчыма толькі на аснове выкананьня і перавыкананьня гэтага пляну на базе сацыялістычнай індустрыялізацыі як ва ўсім Саюзе, так і ў БССР.

Але аўтар ня лічыў сваім абавязкам нават і закранаць гэтыя пытаньні ў сваёй кніжцы. Праўда, на старонцы 94, ён гаворыць аб плянаваньні нашай народнай гаспадаркі. «Пры ўмове пераўтварэньня сельскай гаспадаркі ў буйную сацыялістычную» апошняя «у плянавым парадку будзе прыстасавана... для найбольш поўнага задавальненьня сельска-гаспадарчай прадукцыяй народна-гаспадарчых патрэб». Але ў далейшым ён тлумачыць плянаваньне сельскай гаспадаркі выключна з пункту гледжаньня самазабесьпячэньня ўнутрыгаспадарчых патрэб у межах толькі БССР.

Прычым БССР разглядаецца аўтарам адарвана ад Саюзу.

Аўтар імкнецца пры гэтым працягнуць у сваёй кніжцы шкодніцкую нацдэмаўскую ўстаноўку аб так званай беларускай самабытнасьці. Так на старонцы 29 ён кажа: «значыць трэба ацэньваць севазварот з боку атрыманьня дастатковай колькасьці кармовай прадукцыі адпаведна добрай якасьці. У нашых беларускіх умовах гэтае запатрабаваньне да севазвароту зьяўляецца адным з галоўнейшых гаспадарчых запатрабаваньняў». Няўжо-ж, па думцы аўтара, у жывёлаводчым раёне УССР ці ў другой частцы Саюзу севазварот павінен даць не недастатковую колькасьць кармовай прадукцыі адпаведна ня добрую якасьць яе.?

Як вядома, Беларусія была адной з найбольш моцнааграрна - перанаселеных частак б. царскай Расіі. Гэтая, перанаселенасьць дасталася БССР, як і другім саюзным рэспублікам ад капіталістычнай Расіі. Аграрная перанаселенасьць, як вядома зьяўляецца скрытай формай адноснай перанаселенасьці, як сталага спадарожніка капіталістычнага способа вытворчасьці.

Але, аўтар, спамінаючы ў сваёй кніжцы пра аграрную перанаселенасьць, зусім не растлумачвае чытачу, адкуль гэтая перанаселенасьць узялася. Затое ён паказвае чытачу «верны » шлях для зжываньня гэтай перанаселенасьці. Вось яго шлях. «Відавочна, што ва ўмовах нашага даволі вострага выяўленага аграрнага перанаселеньня, пытаньне працаёмістасьці ёсьць адно з актуальнейшых пытаньняў. Праблема найбольш мэтазгоднага выкарыстаньня дадатковых запасаў працы ў сельскай гаспадарцы, даволі востра стаіць і на сёньняшні дзень. А між тым, пашыраючы ў севазвароце больш працаёмістыя і больш прадукцыйныя культуры, магчыма з пэўным эканамічным эфэктам гэты лішак працы з посьпехам выкарыстаць» (стар. 27). Як бачым шлях зусім варожы дыктатуры пралетарыяту, разьлічаны на далейшае захоўваньне «ідыятызму вясковага жыцьця».

Аўтар праўда можа сказаць, што ім улічвалася роля індустрыялізацыі краіны. Але неабходна адзначыць, што прамысловасьць разглядаецца аўтарам не як рашаючая і вядучая ў справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, а іменна: «машынная тэхніка значна зьмяншае працаёмістасьць севазваротаў, што асабліва важна для практычных пэрыядаў найбольшай працанапружанасьці» (76 стар.). Другімі словамі, па думцы аўтара, прамысловасьць адыгрывае толькі дапаможную ролю ў падняцьці вытворчасьці сельскай гаспадаркі, яна служыць па аўтару, толькі для зьмяншэньня працанапружанасьці ў крытычныя пэрыяды. Нечага казаць, што рэкамэндуемы аўтарам шлях да зжываньня, аграрнай перанаселенасьці, якая дасталася нам ад царызму, як роўна і яго тлумачэньне ролі індустрыялізацыі ў справе сацрэканструкцыі сельскай гаспадаркі наскрозь контррэвалюцыйны, бо гэтыя «ўстаноўкі» аўтара зьяўляюцца па сутнасьці агітацыяй супроць адыходніцтва ў прамысловасьці, супроць плянавага пераразьмеркаваньня працоўных рэсурсаў паміж прамысловасьцю і сельскай гаспадаркай, а значыцца яны ў корані разыходзяцца з палітыкай сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны Саветаў.

Ва ўмовах сацыялістычнай плянавай гаспадаркі севазварот для таго ці іншага спэцыялізаванага раёну і кожнай сацыялістычнай гаспадаркі ў іх вызначаецца плянавым заданьнем. Севазварот, пабудаваны на падставе апошніх дасягненьняў агратэхнікі, зьяўляецца адным з моцных сродкаў для выкананьня і перавыкананьня гэтага плянавага заданьня, як з колькаснага, так і з якаснага бакоў.

А як глядзіць аўтар на гэтае пытаньне? Дамо слова самому аўтару. «Магчыма вызначыць найбольш важныя арганізацыйна - вытворчыя падставы, грунтуючыся на якіх, можна падыходзіць да арганізацыі севазвароту і да іх характарыстыкі і гаспадарчай ацэнкі» (стар. 26). «Каротка» пералічаныя «паказьнікі», па якіх магчыма меркаваць наколькі гэтыя задачы севазваротам «вырашаюцца» наступныя: 1) вышыня агульнай прадукцыі, 2) прадукцыйнасьць працы, 3) працаёмістасьць севазвароту і разьмеркаваньне работы па пэрыядах, 4) кармовая прадукцыя, 5) самазабясьпечаньне севазваротаў, 6) таварная прадукцыя севазваротаў»...

Вось і ўсе асноўныя гаспадарчыя задачы, якія па думцы аўтара, павінен задавальняюча вырашаць «нанова арганізаваны севазварот» (30 ст.).

Як бачым, аўтар зусім ігнаруе плянавае заданьне. Не ўсякая валавая таварная прадукцыя нам патрэбна. Нам патрэбна ад севазвароту такая прадукцыя, якая вызначаецца плянавым заданьнем. Гэта значыць што севазварот павінен так будавацца каб у ільнаводнай, скажам, гаспадарцы (саўгасе альбо калгасе) забясьпечыць у максымальнай меры ўсе магчымасьці для найбольш пасьпяховай культуры лёну, у бульбяна - жывёлагадоўчым саўгасе, альбо калгасе ў максымальна - магчымай меры забясьпечыць найбольш пасьпяховае разьвіцьцё бульбы і сьвінагадоўлі. У ільнаводным саўгасе альбо калгасе галоўная таварная прадукцыя для здачы дзяржаве будзе лён, а ў бульбяна - жывёлагадоўчых саўгасах або калгасах — сьвіньні і бульба.

Што-ж да кармовой прадукцыі, то яна таксама будзе розная ў розных спэцыялізаваных гаспадарках. У бульбяна - жывёлагадоўчым саўгасе або калгасе гэтая прадукцыя павінна ў максымальнай меры забясьпечыць кармамі асноўную жывёлагадоўчую галіну — сьвінагадоўлю, у канопля - жывёлагадоўчай гаспадарцы — асноўную жывёлагадоўчую галіну — малочную жывёлу.

Аўтар-жа, выходзячы з сваёй шкоднай выточнай «устаноўкі», вучыць чытача, што севазварот «выбіраецца» і пры тым выходзячы толькі з рыначных і прыродных умоў. Аб плянавым-жа заданьні ён нават і словам не абмовіўся. Для яго плянавае заданьне—такі «пусьцяк», — пра які і казаць нечага.

У адпаведнасьці з такімі поглядамі ён дае і зусім варожы нам «чаянаўскі» «мэтад» падыходу да распрацоўкі севазвароту. Вось яго «падыход»: «адзін, скажам, падыход будзе да арганізацыі севазвароту на лёгкіх бульбяных глебах і зусім другі на сугл..інках, дзе добра ўдаецца лён, які карысьцю прадаецца. Пры гэтым, калі прыродныя ўмовы і аднолькавыя (глебавыя ўмовы), але адна гаспадарка знаходзіцца блізка ад вялікага го-

*). Дарэчы сказаць сама фармулёўка аўтарам задач яго кніжкі гаворыць аб няправільных выходных пазіцыях аўтара ў разуменьні разьбіраемага ім пытаньня.

Вышэй сьцягі барацьбы

за пяршынство ў спаборніцтве

Ва ўпартай бальшавіцкай барацьбе за пяршынства ў другім Усебеларускім конкурсе спараных брыгад 24 паравозы ня толькі выканалі, але нават перавыканалі асноўныя паказьнікі вызначаных ва ўмовах конкурсу. Паравозы зрабілі 9806 кілёмэтраў перапрабегу і з'эканомілі 131 тону паліва. 16 паравозаў з'эканомілі 793,4 кг. змазачных матар'ялаў. 6 паравозаў трапілі ў лік адстаючых, як ня выканаўшых асноўных паказьнікаў конкурсу, бо маюць перапал 19,5 тон паліва.

16 паравозаў маюць 316 кг. перарасходу змазачных матар'ялаў.

Сярэдні сутачны прабег паравозу на Гомельскім дэпо складае 97,1 проц. па пасажырскіх паравозах і 100 проц. па таварных паравозах. Трэба адзначыць, што толькі за 20 дзён сакавіка па Гомельскім дэпо налічваецца 28 выпадкаў зрыву спаранай.

Аб чым гэта сьведчыць? Перш за ўсё гэта сьведчыць аб тым, што дрэнна арганізавана работа спараных брыгад, слаба пастаўлена працдысцыпліна, адсутнічае выразны графік руху паравозных брыгад. Вось прыклад. Снопўскі паравоз з Гомеля быў адпраўлены рэзэрвам, а потым быў запатрабаваны паравоз з Гомельскага дэпо пад цягнік на Снопўск. Такіх выпадкаў шмат.

Але, побач з адмоўнымі фактамі ў рабоце Гомельскага дэпо ёсьць шмат прыкладаў узорнай бальшавіцкай барацьбы паравозных брыгад за права ўдзелу ў конкурсе.

Камсамольскі паравоз Щ—3125 з цягнікам 825 атрымаў заданьне ад дыспэтчара і прыбыў раней раскладу ў Жлобін на 1 гадзіну. Гэтае заданьне паравозная брыгада ня толькі выканала, але і перавыканала: прыбыў цягнік у Жлобін на 1 гадз. 15 хв. раней.

Па-бальшавіцку рэалізуючы шэсьць умоў правадыра тав. Сталіна, пашыраючы вопыт лепшых спараных брыгад, партыйныя і прафэсіянальныя і гаспадарчыя арганізацыі чыгункі шляхам узмацненьня палітычна-масавай работы сярод рабочых чыгункі павінны забясьпечыць бальшавіцкія тэмпы і якасьць барацьбы брыгад у другім Усебеларускім конкурсе спараных.

Работа конкурсных паравозаў БССР з 1 па 15 сакавіка

Пасажырскія

1. СУ—9769 Мікуловіч, Гускін (дэпо Ворша)—283,9 балаў.
2. С—56 Шпакоўскі, Паліцан (дэпо Віцебск)—222,1 балаў.
3. С—112 Дзяніcаў, Шульга (дэпо Гомель)—99,8 балаў.
4. С—12 Ветраў, Вялько (дэпо Віцебск)—92,8 балаў.
5. С—303 (2 Барадзін, Самадум (дэпо Гомель)—84,4 балаў.
6. Су—9787. Ветраў, Касыко (дэпо Менск)—68,4 балаў.

Таварныя паравозы

1. Щ—373. Цыльке, Жаўнерчык (дэпо Менск)—427 балаў.
2. ОВ—6016. Купрэеў, Хмялеўскі (дэпо Менск)—389.1 балаў.
3. Щ—22. Рыжанскі, Дакукін (дэпо Ворша)—353,7 балаў.
4. ОЧ—6761. Сенчаў, Грышчанка (дэпо Гомель)—351,6 балаў.
5. ОЧ—2. Прастакоў, Леановіч (дэпо Гомель)—317 балаў.
6. Щ—1687. Вігдорчык, Сенажэнскі (дэпо Жлобін)—315,14 балаў.
7. Ц—1689. Зялёнка, Хохаў (дэпо Жлобін)—180,97 балаў.
8. Э—91. Кулеш, Шчарбакоў (дэпо Віцебск)—130,1 балаў.
9. Щ—2055. Нічык, Саколік (дэпо Гомель)—116,4 балаў.
10. Щ—419-2. Рачко, Авялёнак (дэпо Віцебск)—94,2 балаў.
11. Э—44. Дашкоў, Анохім (дэпо Віцебск)—83 балаў.
12. ОВ—7269. Пазьняк, Крапан (дэпо Полацк)—79 балаў.
13. Щ—323. Якуповэўскі, Станулiс (дэпо Ворша)—64,9 балаў.
14. ОВ—5137. Урбановіч, Алёкса (дэпо Асіпавічы)656,37 балаў.
15. Щ—348. Дораш, Антонаў (дэпо Магілёў)—50,9 балаў.
16. Щ—647. Кальцоў, Конюхаў (дэпо Віцебск)—43,6 балаў.
17. Щ—2076. Драздоў, Марозаў (дэпо Жлобін)—43,41 балаў.
18. Щ—657. Аднаблюдаў, Стацько (дэпо Жлобін)—6,24 балаў.

Выбылі з спаборніцтва

1. Паравоз ОВ—6365, брыгады Парніцкага і Саламатнікава (дэпо Асіпавічы) па ліку балаў (плюс 317,87) заняў трэцяе месца сярод конкурсных таварных паравозаў. Аднак, за час конкурсу, брыгада мела адзін зрыў спаранай і таму паводле ўмоў конкурсу выбывае з ліку ўдзельнікаў усебеларускага конкурсу. Цэнтральнае журы зараз дакладна высьвятляе прычыны гэтага зрыву.

2. Паравоз СУ—9875, брыгады Баранава і Крысацкага (дэпо Ворша) па ліку балаў (плюс 153,2) заняў трэцяе месца сярод конкурсных пасажырскіх паравозаў, але, з прычыны таго, што па віне брыгады быў адзін выпадак выплаўкі надшыпніка, паводле ўмоў конкурсу таксама выбывае з ліку ўдзельнікаў Усебеларускага конкурсу.

Ня выканалі асноўных паказьнікаў

1. Паравоз Щ—5089, брыгады Ташкава і Руцэвіча,—дэпо Жлобін (мінус 316,71 балаў).
2. Паравоз ОВ—1542, брыгады Шырба і Дарашкевіча—дэпо Полацк (мінус 252 балы).
3. Паравоз ОВ—7587, брыгады Яворскага і Наварая—дэпо Калінкавічы (мінус 167,7 балы).
4. Паравоз Щ—482, брыгады Мармулеўскага і Хадкевіча,—дэпо Магілёў (мінус 84,4).
5. Паравоз Щ—4534, брыгады Шчагалькава і Лунёва—дэпо Гомель (мінус 36 балаў).



ПАРАВОЗ С-13, машыніст растлумачвае памоцніку як трэба змазываць машыну.

Па Гомельскім раёне ўперадзе ідуць:

па пасажырскім (С-52), па таварным (ОЧ-4631)

Работа конкурсных паравозаў за пятую пяцідзёнку

№№ паравозаў	Прабег	Экан. паліва	Балы
Па пасажырскіх паравозах:			
С-52	104,5	17,9	232,8
С-112	94,8	4,8	36,8
С-303/2	107,3,	1,1	42,4
С-331	104,0	11,1	149,2
С-814	96,9	12,9	142,4
Па таварных паравозах:			
Щ-579	124,6	25,5	379,2
Щ-1551	107,3	12,8	182,8
Щ-2055	103,0	15,2	194,4
Щ-3125	117,0	13,8	233,5
Щ-4534	110,8	6,3	118,8
ОЧ-2	91,1	29,9	323,2
4631	106,2	36,4	461,6
6761	129,5	26,9	410.8

28 выпадкаў зрыву спаранай

За 20 дзён сакавіка процант хворых паравозаў, у дэпо Гомель у сярэднім складае 15,1 проц. супроць заданьня 14,36 проц.

Сярэдні сутачны прабег пасажырскага паравоза 334 кілмтр. супроць заданьня 293. Сярэдні сутачны прабег таварных паравозаў за гэты час 100 проц. заданьня.

Прастой паравозу ў гарачай прамыўцы складае 10,7 гадз. супроць заданьня 10 гадзін. Паўторнасьці рамонту за 20 дзён было 3 выпадкі па віне сьлесароў ступенчатага дэпо.

Затрымак паравозаў пад цягнікі было 4 выпадкі, з іх 2 па віне парбрыгад і 2 па віне дэпо.

Зрываў спаранай было 28 выпадкаў, з іх па хваробе 17, па камандыроўках—3 і 1 выпадак адказ ад работы і астатнія па другіх прычынах.

Факты гаворыць за тое, што Гомельскае дэпо слаба яшчэ змагаецца за ажыцьцяўленьне настаўленых задач другім Усебеларускім конкурсам спараных.

Пін.

Вопыт сацыялістычнай пуцёўкі

27-га сакавіка камсамольскі паравоз № Щ 3125, удзельнік 2-га ўсебеларускага конкурсу, з цягнікам № 825 са станцыі УЗА дыспэтчарам Прыходзька была ўручана сацыялістычная пуцёўка—прыбыць у Жлобін раней раскладу на 1 гадзіну.

Упартай барацьбой за выкананьне свайго заданьня брыгада дабілася перамогі. Цягнік прыбыў у Жлобін раней раскладу на 1 гадзіну 15 хв

28-га сакавіка паравоз—1517, цягнік № 804, які ішоў са Жлобіну ў Гомель таксама атрымаў сацыялістычную пуцёўку—прыбыць у Гомель раней раскладу на 1 гадзіну. Але-ж машыніст прыбыў у Гомель толькі на 22 хвіліны раней, бо цягнік быў запрыманы на ст. Салтанаўка не па віне паравознай брыгады.

С.

Дыспэтчары зноў зрываюць

карысную дзейнасьць паравозаў

23-га сакавіка ў Калінкавіцкім абаротным дэпо паравоз № 6761 быў не ратрыманы на 9 гадзін 40 хв., бо несваячасова быў зроблены рамонт паравозу.

26 сакавіка ў Жлобінскім абаротным дэпо паравоз № 7090 быў таксама пратрыманы на 1 гадзіну 45 хв. з прычыны дрэнных адносін дэпо да рамонту.

З прычыны дрэннага рэгуляваньня і адсутнічаньня цьвёрдага графіку руху цягнікоў 26 сакавіка паравоз з Гомеля быў адпраўлены ў 23 гадзіны рэзэрвам, а 27-га сакавіка ў 10 гадзін раніцой быў запатрабаваны паравоз з дэпо ў Гомель пад цягнік на Снопўск.

Л.

МАШЫНІСТЫ ЗАЙЦАЎ і ДЗЯМІДЗЕНКА

аб вопыце сваёй работы

Атрымаўшы паравоз 9—5333, 15-II—32 г. у разьбітым стане, мы ўпартай работай, старанным даглядам, уважлівымі адносінамі да рамонту дабіліся станоўчых рэзультатаў.

У цэнтр сваёй работы ставілі ня толькі выкананьне ўсіх вымернікаў, але і сьледваньне дакладна па расьпісаньні, якога трымаемся ўсю дарогу—тут дапаможнікам зьяўляецца гадзіньнік.

На астаноўках трымаем сувязь з дыспэтчарскім апаратам. Адсюль наша правільнае, дакладнае сьледваньне, без спазьненьняў на аднашляховым вучастку—176 кл. з грузам—1.600 тон.

У перыяд першага конкурсу мы мелі эканомію паліва дзякуючы правільнаму апальваньню. Добрым даглядам за паравой машынай зьнішчана перанье задзіраў.

Часта гутарым паміж сабой ня толькі па абслугоўваньні паравозу і правілах тэхнічнай эксплёатацыі, але займаемся і інструктажам сваіх памочнікаў у адносінах правільнага апалу і правільнай мешаніны вугля, ад чаго ў нас стварaецца эканомія. Дзякуючы захаваньню гаспадарчага разьліку і прысутнасьці пры прамыўцы абодвых брыгад, дакладным аналізам усёй работы, мы дабіліся добрага стану паравозу. Дробны рамонт праводзім самі.

У нас работа разьмеркавана так: тав. Зайцаў (машыніст) адказвае перад намі за рамонт і вядзе нагляд за ім. Тав. Дзямідзенка адказвае за чыстату і якасьць струманту. Праз плянавае разьмеркаваньне ўсёй работы сярод нас (невялікую «японізацыю») мы дабіліся раду станоўчых рэзультатаў па рамонце (не рамантуем ад прамыўкі да прамыўкі). Чыстату на паравозе мы падтрымліваем кожны дзень, дзе-б мы не знаходзіліся.

Адсюль і прабег паравозу.

У нас таксама ёсьць эканомія ў змазачным матар'яле, бо акуратна яго выдаткуем. Мы ўзялі на сябе абавязацельства: пры запраўцы паравозу ніводнай кроплі змазкі на зямлю.

Рамантуючы паравоз агульнымі сіламі, мы эканомім свае ліміты па змазцы і бятучым рамонце. Вось лічбы:

Жнівень 1931 году—267 р.

Лістапад 1931 году—175 р.

Сьнежань 1931 году—180 р.

Гэта гаворыць за тое, што пры правільнай рабоце, пры эканоміі матар'ялу, мы дасягаем значных рэзультатаў. Вучот па гаспадарчым разьліку—таксама важнейшае мерапрыемства. Таму мы самі сочым за правільным вядзеньнем рахункаводам падлікаў, лімітаў і чакаў, дапамагаючы ў падліках.

Дасягнуўшы станоўчых вынікаў у рабоце, мы заяўляем, што працаваць чотка на транспарце можна

У часе прапрацоўкі загаду тав. Андрэева на сваім паравозе мы выявілі рад недахопаў, якія зжываем.

Нагрузкі нашы: адзін старшыня вытворчага сэктару, другі член партбюро, трэці член камісіі па праверцы ўдарніцтва.

Машыністы: Дзямідзенка і Зайцаў.

раду і мае магчымасьць дастаўляць малако ў горад у сьвежым выглядзе, а другая знаходзіцца далёка ад буйнага рынку, дык у гэтай гаспадарцы трэба зусім інакш арганізаваць севазварот. Першая гаспадарка паменшыць плошчу пад зярнёвымі і будзе больш сеяць кармавых малакагонных расьлін. Другая-ж гаспадарка відавочна па гэтаму шляху ня пойдзе. Магчыма, што яна зробіць націск на разьвіцьцё сьвінагадоўлі ў сувязі з чым будзе імкнуцца пашырыць засеў бульбы і канцэнтраваных зярнёвых кармоў» (стар. 25).

І далей, разглядаючы кармовае 8-міпольле з бульбяным кірункам ён піша: «у саўгасах і калгасах, якія знаходзяцца блізка чыгункі, магчыма яшчэ першае поле займаць раньняй сталовай бульбай» (стар. 37).

Адсюль яскрава відаць, што асноўным вызначаючым момантам пры «выбары» севазвароту аўтар лічыць умовы рынку, што зьяўляецца характэрным для стыхійна разьвіваемай капіталістычнай гаспадаркі, на якую, як ві даць, фактычна і разьлічана яго кніжка.

Такім чынам, аўтар тут выступае супроць вызначаючай ролі плянавага заданьня ў справе арганізацыі сацыялістычнай сельскай гаспадаркі і наогул супроць сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і гэтым самым па сутнасьці зусім адкрыта стаіць за капіталістычны шлях разьвіцьця сельскай гаспадаркі БССР.

Севазварот, па думцы беларускіх кандрацьеўцаў, «выбіраецца» для буйных гаспадарак «наогул», а не распрацоўваецца для кожнага сацыяльнага тыпу (саўгасаў альбо калгасаў). У нашай сельскай гаспадарцы з улікам тых асаблівасьцяў, якія паміж імі існуюць на даным этапе.

Зусім ігнаруе аўтар пры падыходзе да ўстанаўленьня севазваротаў і сацыяльны тып у нашай сельскай гаспадарцы. Ён раіць падыходзіць да ўстанаўленьня севазвароту не ў разрэзе саўгасаў або калгасаў, а наогул, безадносна да сацыяльнага тыпу ў нашай сельскай гаспадарцы, што зусім недапушчальна.

Больш таго нашы сацыялістычныя гаспадаркі аўтар ставіць нараўне з кулацкімі гаспадаркамі. Так на старонцы 23 ён кажа: «матар'яламі для апрацоўкі дэманстраваных севазваротаў зьявіліся вынікі гаспадарчай практыкі ў гэтай галіне саўгасаў, калгасаў, індывідуальных сялянскіх гаспадарак і навуковыя дасягненьні беларускіх дасьледчых станцый».

Бяз сумненьня пад відам «індывідуальных сялянскіх гаспадарак» аўтар мае на ўвазе прышчэпаўскія «культурныя» гаспадаркі, гэта значыць кулацкія гаспадаркі, бо ўсякаму вядома, што калі севазвароты і былі ў «сялянскіх» гаспадарках, (а такіх выпадкаў было надзвычайна мала), дык былі толькі ў некаторых кулацкіх гаспадарках. І вось «практычныя дасягненьні» гэтых кулацкіх гаспадарак аўтар і прапануе ўкараніць у сацыялістычныя гаспадаркі — саўгасы і калгасы. Прычым аўтар упарта стараецца даказаць чытачу, што правільны севазварот магчым і ва ўмовах «індывідуальнай сялянскай гаспадаркі». А таму і да «выбару» севазваротаў ён падыходзіць з аднолькавай меркай і да саўгасаў, і да калгасаў і да «індывідуальных сялянскіх гаспадарак».

Нечага казаць, што такі падыход да складаньня севазвароту ёсьць працягваньне шкодніцкай устаноўкі аб тым, што нашы пасьлядоўна-сацыялістычныя гаспадаркі—саўгасы і сацыялістычныя гаспадаркі—калгасы нібы нічым не адрозьніваюцца ад «індывідуальнай сялянскай гаспадаркі».

Увядзеньне правільнага севазвароту зьяўляецца ва ўмовах нашай сацыялістычнай гаспадаркі адным з моцных способаў павышэньня прадукцыйнасьці працы ў сельскай гаспадарцы на аснове правільнага выкарыстаньня наяўных сродкаў вытворчасьці і пры рацыянальным выкарыстаньні прыродна-гістарычных асаблівасьцяй пэўнага раёну і асобнай сацыялістычнай гаспадаркі.

Гэта значыць, што найлепшым севазваротам будзе такі, які пры найменшай затраце працы і сродкаў вытворчасьці забясьпечыць найвышэйшую прадукцыйнасьць працы, ці інакш кажучы, які дасьць найбольшую колькасьць валавой прадукцыі (зноў-жа ня ўсякай прадукцыі, а той, якая прадугледжана плянавым заданьнем) у пераразлікладзе на адзін дзень рабочага саўгасу або калгасьніка.

Усім нам вядома, што толькі рабочая сіла зьяўляецца суб'ектам вытворчасьці, які мэтазгодна накіроўвае ўсе сродкі вытворчасьці, згодна прызначэньня.

Але аўтар зусім правільна кажучы, што «лепшым будзе той севазварот, які пры аднолькавай агульнай прадукцыі дае найвышэйшую прадукцыйнасьць працы аднаго дню». (стар 26), падышоўшы да характарыстыкі севазваротаў па агульнай прадукцыі бярэ далей зусім другі «паказьнік» прадукцыйнасьці працы—гэта кашто ўнасьць агульнай прадукцыі ў рублёх у пераразлікладзе на адзін га пасеву.

Гэтым самым аўтар працягвае ў свай кніжцы буржуазны пагляд аб так званай вытворчасьці зямлі, працы і капіталу. А паколькі так, то аўтар не дае і ня можа даць чытачу правільнага разуменьня пытаньняў арганізацыі працы і фактычна выступае супроць таго, што правільная арганізацыя працы мае рашаючае значэньне ў справе падвышэньня прадукцыйнасьці працы ў нашай сацыялістычнай сельскай гаспадарцы.

Зусім зразумела, выходзячы з усяго вышэйсказанага, што аўтар нават і не задаваўся мэтай паказаць чытачу, што севазварот у саўгасе і калгасе павінен будавацца такім чынам, каб наша сацыялістычная сельская гаспадарка магла ня толькі выконваць, але і перавыконваць плянавыя заданьні ў адпаведнасьці з тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва. Аўтар ня ставіць такой задачы перад сваімі севазваротамі. Яго севазвароты, у адпаведнасьці з кандрацьеўска-чаянаўскім разуменьнем самадаўлеючай ролі севазвароты ў гаспадарцы, прадстаўляюць сабой замкнуты «круг» пэўнага чаргаваньня культур.

Г. Р.

(Працяг будзе).

ПА ПРЫКЛАДУ ПЕРАДАВЫХ

падцягваюцца адстаючыя

40.000 рублёў у сацыялістычны ўклад—„Пяцігодка ў 4"

МАГІЛЕЎ (Наш кар.). У сувязі з штурмавым дэкаднікам, па ініцыятыве рабочых сталінцаў і газэты «Камунар Магілеўшчыны» абвешчана спаборніцтва па сацыялістычным укладзе «5 у 4» да канца пяцігодкі ў ашчадкасу, якое ператварылася ў масава-палітычную кампанію. На аснове разгортваньня масавай работы, кожны дзень дае новыя

Калгасьнік тав. НІСЬЕЎ СЯМЁН, ударнік фінфронту.

перамогі на фронце сацыялістычных укладаў.

На гарбарні імя Сталіна за апошнія пяць дзён сабрана і афармлена падпіска на сацыялістычны ўклад «5 у 4» звыш 4.000 руб., на шоўкавай фабрыцы—звыш 5.000 руб. Па Магілеўскім палітасьветкамбінаце сярод выкладчыкаў і студэнтаў сабрана падпіска на 5 тыс. руб. Работнікі саюзу мэдсанпрацы падпісаліся на 4.160 руб., рабочымі заводу «Адраджэньне» сабрана звыш 2 тыс. руб. На швэйнай фабрыцы—звыш 2 тыс. руб., па арцелях Магпрамсаюзу сабрана 10.212 руб. Друкарня імя Молатава мае падпіску на 550 р., на мэталязаводзе Магпрамсаюзу сабрана падпіскі і афармлена на сацыялістычны ўклад «5 у 4» звыш 40 тыс. руб.

С.

Ініцыятыва сталінцаў дала свой адбітак таксама і ў сельсаветах, і ў калгасах. Асаблівa ўдарную работу па сацыялістычным укладзе паказвае Княжыцкі сельсавет За 4 дні з дапамогаю выязднай рэдакцыі «Камунар Магілеўшчыны», Княжыцкі сельсавет сабраў і аформіў падпіску на сацыялістычны ўклад на 1.214 руб. Разгарнуў шырокую работу і Бракаўскі сельсавет, які сабраў падпіску звыш 400 руб.

У адказ на тэлеграму тав. Хацкевіча, раённыя арганізацыі, рабочыя ўдарнікі і калгасьнікі заяўляюць, што фінплян 1-га кварталу будзе выкананы.

Зараз па горадзе сярод прадпрыемстваў разгарнулася шырокае спаборніцтва на пяршынства па 100-процантным ахопе рабочых і служачых сацуклададамі да 1 красавіка і хутчэйшым унясеньні грошай у ашчадкасу па сацукладзе.

Кожны працоўны Магілеўшчыны павінен быць удзельнікам сацыялістычнага ўкладу.

АЛ. НЁМАНСКІ.

Раўняцца па калгасу імя Чырвонай арміі

РАГАЧЭЎ (Беларусь). Калгас імя Чырвонай арміі: паказвае прыклады бальшавіцкай барацьбы за выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў. Заданьне па абавязковых плацяжох калгас выканаў поўнасьцю раней вызначанага тэрміну. Запазычанасьць мінулага году ў 21505 р. ужо ліквідавана. Калгас датэрмінова ўнёс у лік пагашэньня фінансавых абавязацельстваў 1932 году 275 р. Заданьне па рэалізацыі пазыкі калгас перавыканаў на 1000 р. і ўжо поўнасьцю ўнёс суму падпіскі. Калгас набыў акцый Трактарацэнтру на 1710 рублёў і машынных абавязацельстваў на 930 рублёў.

Калгас імя Чырвонай арміі выклікае на сацспаборніцтва па лепшым выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў наступныя калгасы раёну: калгас імя Леніна, «Ніва Кастрычніка», «Равенства» і калгас імя тав. Сталіна.

Усе калгасы раёну павінны пасьледваць прыкладу ў мабілізацыі сродкаў калгасу імя Чырвонай арміі.

Падпісчык пазыкі павінен атрымаць замацавальныя талёны

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). На буйных прадпрыемствах Барысаўшчыны яшчэ не раздаты замацавальныя талёны па падпісцы на пазыку «3-ці рашаючы». Агульная сума нераздадзеных талёнаў складае 22.825 руб. На Бярэзінскім камбінаце талёнаў не раздадзена на 9.000 руб., на камбінаце «Камінтэрн»—7.825 руб., на «Домбалі»—6.000 руб.

Такім чынам падпісчыкі на пазыку былі пазбаўлены магчымасьці ўдзельнічаць у першым і другім тыражу розыгрышаў пазыкі.

Гэта і зьяўляецца адной з прычын дрэннай рэалізацыі пазыкі. На Бярэзінскім камбінаце падпіска на пазыку складае 56 проц. месячнага фонду зарплаты, на «Камінтэрне» — 73 проц. і на «Домбалі»—75 проц.

Трэба прыняць усе меры да таго, каб замацавальныя талёны былі зараз-жа раздаты, канкрэтныя вінаватыя ў гэтай справе павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

С.

Раўняцца па перадавікох фінфронту

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Разгортваючы баявыя тэмпы працы, мабілізуючы на выкананьне фінансавага пляну шырокія масы працоўных, Бабруйскі ЦРК, ЗРК дрэваапрацоўчага камбінату, закрыты вайсковы каапэратыў і закрыты каапэратыў швэйнікаў справіліся з выкананьнем фінансавага пляну першага кварталу чацьвертага заключнага году пяцігодкі.

Па БЦРК фінплян выкананы на 203 проц., па ЗРК камбінату—на 202 проц., па ЗВК—на 107,2 проц. па ЗРК швэйнікаў—на 102 проц. Набліжаюцца да выкананьня фінпляну гарсавет і лесрабкоп.

Іншыя арганізацыі Бабруйшчыны павінны перанесьці ў сваю работу прыклады баявой дзейнасьці гэтых перадавікоў і выканаць фінплян чацьвёртага заключнага.

А. ДАМБРОЎСКІ.

Брыгадзе—добры ўлік

50 гаспадарча-разьліковых брыгад налічвае ільнапрадзільная фабрыка «Дзьвіна». Але работа брыгад не дае належнага гаспадарчага эфэкту. Брыгады працуюць упустую, за іх працай амаль нiхто ня сочыць. Улік эфэктыўнасьці працы брыгад пачаўся толькі з 1-га сакавіка. Формы для ўліку выпрацоўкі поўнасьцю не прыстасаваны да працы гаспадарча-разьліковых брыгад.

Брыгадзіры ня ўмеюць запаўняць формы ўліку, а некаторыя імі проста не карыстаюцца, бо брыгадзіры не праінструктаваны ў гэтым напрамку.

Некаторыя брыгады за кароткі час увядзеньня ўліку па ўдарнаму ўзяліся за работу і перавыконваюць свой прамфінплян. Да такіх брыгад адносяцца гаспадарча-разьліковая брыгада Марчанка, матальнага цэху, група «В». За першую пяцідзёнку сакавіка брыгада выканала прамфінплян на 115 проц., за прыкладную работу брыгада прэміявана.

Гаспадарча-разьліковая брыгада Камлёнак, матальнага цэху, групы «А», у якой налічваецца 6 чал., працуючы на 8-мі машынах, таксама перавыконвае свой прамфінплян. Замест 41 зьёму паводле пляну, брыгада выпрацоўвае ў сярэднім штодзённа 45-47 зьёмаў.

Н.

Замацаваць посьпех

Брыгада разьліваль шчыкаў імя «Парыскай камуны» заводу «Чырвоны мэталіст» налічвае 28 чалавек. Брыгада паказвае ўдарныя прыклады барацьбы за прамфінплян.

Колькаснае заданьне брыгадай выканана на 109 процантаў. Упарта змагаючыся за якасны выраб прадукцыі, брыгада дабілася зьмяншэньня браку з 4,16 проц. да 2,16 проц. Эканамічны эфэкт рамонту каўшоў выражаецца ў 62 рублі. Прагулаў і спазьненьняў на работу брыгада ня ведае. Усе члены брыгады на 100 пр. ахоплены тэхвучобай.

Сваю салідарнасьць з пазнявязьнямі капіталу брыгада даказала пагашэньнем запазычанасьці па членскіх узносах у МОПР за 1931 г. і зборам членскіх узносаў за 6 месяцаў 1932 году. Брыгада абяцае і надалей замацаваць дасягнутыя посьпехі.

Брыгадзір «С. Б.» Шыдлоўскі.

За суцэльна—пісьменную БССР

Шырока скарыстаць вопыт лепшых

Баявая задача кожнага няпісьменнага

Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат мае за апошні час значныя посьпехі ў галіне ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці.

25-га сакавіка ў клюбе адбыўся выпуск 66 няпісьменных і малапісьменных рабочых камбінату з школ лікбезу.

Выпускнікі—месяцы тры таму назад няпісьменныя рабочыя камбінату—т. Уман і Шульман—у сваіх выступленьнях заверылі парткалектыў і заўком заводу, што яны і надалей будуць змагацца з няпісьменнасьцю.

Аўладаньне вялікай зброяй—граматай, гавораць тав. Уман і Шульман, павінна стаць чарговай баявой задачай кожнага няпісьменнага рабочага. Навучыцца чытаць і пісаць, разьбірацца ў пытаньнях бягучага моманту і задачах партыі і ўраду аб будаўніцтве сацыялізму—павінен умець кожны рабочы.

Асаблівую энэргію і энтузіязм у справе барацьбы за суцэльна пісьменны камбінат праявіў настаўнік шостага заводу тав. Шульгін, які за ўдарную работу прэміяваны заўкомам ганаровай граматай ударніка і месячным акладам пэнсіі.

Выпускны вечар няпісьменных павінен паслужыць стымулем далейшых посьпехаў у галіне пасьпяховага выкананьня дырэктыў партыі і ўраду аб ператварэньні камбінату ў суцэльна-пісьменны.

С. Дальні.

Школьнае будаўніцтва зрываецца

У гэтым годзе ў БССР будзе пабудавана 8 новых сямігодак, 4 аднакамплектныя школы II канцэнтру, 32—2-х камплектныя школы і 11 дамоў сацыялістычнай культуры. Апрача гэтага павінна быць скончана пабудова 315 аб'ектаў, пачатых яшчэ ў 1931 годзе.

Падрыхтоўка да гэтага будаўніцтва ідзе нездавальняюча і стварае пагрозу выкананьню пляну будаўніцтва.

Асноўная прычына — дрэнная загатоўка будаўнічых матар'ялаў.

Калегія Наркамасьветы абавязала ўсіх загадчыкаў, раённых інспэктараў народнае асьветы тэрмінова разгарнуць работу па падрыхтоўцы і вывазцы будматар'ялаў для школ. Загадчыкі навучальных устаноў, у якіх вызначаны новыя аб'екты школьнага будаўніцтва, павінны ў 2-х дэкады тэрмін заключыць умовы з адпаведнымі будаўнічымі арганізацыямі.

Б. Т.

Раўняцца па Асавецкім сельсавеце

Узорам бальшавіцкай барацьбы за суцэльную пісьменнасьць зьяўляецца Асавецкі сельсавет, Любаньскага раёну. Шляхам разгортваньня масава-растлумачальнай работы сярод няпісьменных і малапісьменных, партыйныя, камсамольскія і савецкія арганізацыі гэтага сельсавету дамагліся вялізарных посьпехаў.

За час дэкадніка барацьбы з няпісьменнасьцю, усе няпісьменныя ахоплены навучаньнем і рэгулярна наведваюць заняткі лікпунктаў. Малапісьменныя ахоплены навучаньнем на 70 проц.

На тэрыторыі сельсавету налічваецца 6 ячэек т-ва «ПП», праз якія наладжана індывідуальнае навучаньне тых няпісьменных, якія ня маюць магчымасьці наведваць лікпункт. Ліквідуецца таксама няпісьменнасьць сярод дапрызыўнікаў 1910 г., якія на ўсе 100 процантаў ахоплены навучаньнем.

Усе астатнія сельсаветы раёну павінны пасьледваць прыкладу Асавецкага сельсавету з тым, каб дырэктывы ЦК КП(б)Б выканаць з посьпехам і ў тэрмін ператварыць свае сельсаветы ў суцэльна-пісьменныя.

Кунрэш Т.

Выканаць абавязацельствы

Бярэзінская ШКМ паставіла мэтай да 1-га мая 1932 г. поўнасьцю ліквідаваць няпісьменнасьць сярод рабочых саўгасу «Бярэзіна». У гэтым саўгасе ШКМ арганізаваны лікпункт, куды вылучаны адпаведны выкладчык.

Каб ліквідаваць прарывы, лікпункт перайшоў на штодзённую работу. Гэты пераход даў належныя вынікі. Дзякуючы зацікаўленасьці саміх няпісьменных, наведваньне і пасьпяховасьць значна палепшылася.

Зараз на работу у лікпункт вылучана настаўніца Чыж, якая не жадае працаваць. «Работа на лікпункце—гаворыць Чыж,—бескаштоўная і я займацца ня буду».

Атрыманы зрух ў рабоце лікпункту трэба замацаваць, трэба не дапусьціць ніякіх перабояў у рабоце. Мясткам павінен разглядзець справу ігнараваньня настаўніцаю Чыж работы лікпункту, павінен прымусіць яе працаваць так, каб узятыя абавязацельствы аб датэрміновай ліквідацыі няпісьменнасьці былі выкананы.

Снайпэр.

Ліквідаваць прарыў

У справе ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці Касьцюковіцкі раён адстае.

У раёне па няпоўных вестках налічваецца няпісьменных 7.050 чал., з іх вучобай ахоплена 6.465 чал., што складае 91,7 проц. Малапісьменных ахоплена навучаньнем толькі 56,9 проц.

Лікпункты наведвае ня больш як 30-45 проц. няпісьменных. На некаторых лікпунктах няма дакладнага вучоту наведваньня. Талоны пазыкі «За суцэльную пісьменнасьць БССР» не распаўсюджаны і не даведзены да кожнага лікпункту і няпісьменнага ў паасобку.

Па шэрагу сельсаветаў няма адказных за справу ліквідацыі няпісьменнасьці. Так, настаўнікі і культармейцы Дзіміткавіцкага сельсавету ня ведаюць, хто па сельсавеце адказны за справу ліквідацыі няпісьменнасьці.

З дапрызыўнікамі 1910 году нарады наладжэньня ніякай работы па зьнішчэньні няпісьменнасьці не вядзецца.

У раёне няма работы Райсавету т-ва «Прэч няпісьменнасьць». Арганізаваныя ячэйкі зусім не працуюць.

Пералічаныя недахопы ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці абавязваюць усю грамадзкасьць Касьцюковіцкага раёну неадкладна ліквідаваць прарывы з тым, каб да 1-га мая 1932 г. ператварыць раён у суцэльна—пісьменны.

І. С. Каплан.

Аб стане Беларускай арганізацыі камсамолу

Пастанова ЦК УсеЛКСМ

Камсамольская арганізацыя Беларусі, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, у барацьбе за ленінскую генэральную лінію партыйнай палітыкі, на аснове ленінскага вырашэньня нацыянальнага пытаньня, аказала значную дапамогу партыі ў справе разьвіцьця прамысловасьці, сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі і ў будаўніцтве культуры «нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зьмесьце». У гэтай барацьбе камсамольская арганізацыя ўмацавала і пашырыла свае рады, павысіла клясавую пільнасьць і баяздольнасьць.

Побач з гэтым ЦК адзначае, што кіраўніцтва ЦК ЛКСМБ на радзе важнейшых вучасткаў не забясьпечыла належнай мабілізацыі камсамольскіх мас на хутчэйшую рэалізацыю дырэктыў партыі і выкананьне рашэньняў ЦК УсеЛКСМ ад 23 верасьня 1929 г. па дакладу ЦК ЛКСМБ.

Характэрнай рысай кіраўніцтва ЦК ЛКСМБ і значнага раду камітэтаў камсамолу зьявілася: агульнасьць, адсутнасьць апэрацыйнасьці і праверкі выкананьня; няўменьне вылучыць рашаючыя вучасткі і на іх згрупаваць галоўны ўпор; адсутнасьць належнай барацьбы за бальшавіцкія тэмпы работы, у выніку чаго ў радзе зьвеньняў арганізацыі ёсьць рад буйнейшых недахопаў і паасобныя палітычныя прарывы (ігнараваньне ў радзе месц праведзеньня беларусізацыі, праявы антысэмітызму, засьмечаньне і развал чужым элемэнтам раду ячэек і г. д.).

У працягу значнага часу ў бюро ЦК ЛКСМБ, ня гледзячы на неаднаразовыя патрабаваньні ЦК УсеЛКСМ спыніць склоку,—працягвалася беспрынцыпная барацьба дзьвюх груп, у выніку чаго патрабавалася спэцыяльнае ўмяшаньне ЦК УсеЛКСМ і зьніцце кіраўніцтва. Наяўнасьць беспрынцыпнай склокі зьяўляецца вынікам: месьніцтва, групоўшчыны, адсутнасьці разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі і няпрыняцьця сваячасовых захадаў з боку мясцовых парторганізацый па бальшавіцкім спыненьні групоўшчыны.

Асноўнай задачай камсамольскай арганізацыі Беларусі зьяўляецца далейшая мабілізацыя мас камсамольцаў і працоўнай моладзі на выразнае праведзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі, на актыўны ўдзел у гаспадарча-палітычным і культурным будаўніцтве рэспублікі, арганізуючы на гэтай аснове бязьлітасную барацьбу з усялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі і выхоўваючы масы камсамольцаў і моладзі ў духу сапраўднага інтэрнацыяналізму, узьнімаючы ідэйна-палітычны ўзровень і клясавую баяздольнасьць арганізацыі.

Бюро ЦК УсеЛКСМ прапануе

1. Няўхільна ажыцьцяўляючы 6 умоў тав. Сталіна, сканцэнтраваць сваю галоўную ўвагу на вузлавых, рашаючых вучастках гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, паказваючы на гэтым сваю ўдарную работу ў чацьвёртым **заключным годзе** пяцігодкі.

а) **У галіне транспарту:** ЦК ЛКСМБ і ўсім транспартным ячэйкам камсамолу ўжыць захады, якія-б забясьпечылі пасьпяховую рэалізацыю загаду тав. Андрэева, паляпшаючы якасьць работы спараных брыгад, укараняючы гаспадарчы разьлік на паравозе, арганізуючы барацьбу за захаваньне вагоннага і паравознага парку, за павялічэньне сярэдня-сутачнага прабегу паравоза і вагона.

б) **У галіне прамысловасьці** адзначаючы недастатковы ўдзел камсамолу ў барацьбе за плян, за зьніжэньне сабекошту, за палепшаньне якасьці прадукцыі і, у прыватнасьці абсалютна нездавальняючае выкананьне праграмы торфаздабычы (69 проц.), ЦК прапануе разгарнуць бальшавіцкую барацьбу з гэтымі недахопамі, разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва і работу па стварэньні плянава-апэрацыйных груп і гасразьліковых брыгад. Умацаваць кіруючы склад камсамольскіх арганізацый тарфяных раёнаў, разгарнуць шырокую масавую работу сярод рабочых і дамагчыся асваеньня мэханізмаў камсамольцамі і маладымі рабочымі, у прыватнасьці дамагаючыся павялічэньня фрэзэрнай здабычы торфу.

2. Мабілізуючы масы камсамольцаў і беспартыйнай моладзі на пасьпяховае праведзеньне веснавой сяўбы, у асаблівасьці ў выкананьні пляну пасеву лёну, разгарнуць работу па забясьпечаньні збору насеньня і рамонту інвэнтара, забясьпечыўшы разгортваньне баявой работы па падвышэньні ўраджайнасьці. Стварыць вытворчыя брыгады ў калгасах, асаблівую ўвагу зьвярнуўшы на арганізацыю працы ў брыгадах, укараненьне зьдзельшчыны, складаньне вытворчых плянаў, павышэньне прадукцыйнасьці і якасьці працы і ўстанаўленьне правільных норм выпрацоўкі. Разгарнуць масава-палітычную работу ў брыгадзе, вядучы рашучую барацьбу з клясава-чужым кулацкім уплывам, ачышчаючы калгасы ад кулацкіх элемэнтаў. Арганізаваць правільную расстаноўку камсамольскіх сіл унутры калгасу па брыгадах.

На аснове арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, разгарнуць далейшую барацьбу за ўцягненьне ў калгасы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, рашуча змагаючыся з маючымі месца скажэньнямі—адміністраваньнем у калгасным будаўніцтве, «лявацкімі» заскокамі, пераскокваньнем праз асноўную форму калгаснага будаўніцтва на даным этапе—сельгасарцель. ЦК асабліва зьвяртае ўвагу на недаацэнку разгортваньня работы сярод аднаасобнікаў і прапануе ў далейшым недапушчаць гэтага.

Абавязаць ЦК ЛКСМБ неадкладна прыняць захады да вылучэньня ў якасьці брыгадзіраў лепшых, гаспадарча-палітычна пісьменных камсамольцаў і беспартыйнай калгаснай моладзі, арганізаваўшы сетку кароткатэрміновых курсаў па іх падрыхтоўцы.

Прыняць актыўны ўдзел у арганізуемых партыйнай арганізацыяй на аснове рашэньня ЦК УсеКП(б) курсах-нарадах брыгадзіраў, кіраўнікоў калгасаў і актыву калгасьнікаў.

3. ЦК прызнае слабым удзел камсамолу ў справе разьвіцьця сьвінагадоўлі (адсутнасьць барацьбы за аўладаньне элемэнтарнымі ведамі заатэхнікі, правільным кармленьнем і даглядам, адсутнасьць барацьбы з падзёжам сьвіней) і абавязвае ўдзяліць асаблівую ўвагу будаўніцтву сьвінарнікаў, укамплектаваньню гурту, праведзеньню злучнай кампаніі, арганізацыі СТФ, праводзячы ўсю гэту работу пад лёзунгам барацьбы за «тону апаросу».

ЦК, адзначаючы невыстарчальную дапамогу камсамолу з боку мясцовых савецкіх і гаспадарчых арганізацый Сьвінаводтрэсту, лічыць неабходным рашучае ўзмацненьне ўвагі і дапамогі камсамолу з боку гэтых арганізацый у справе вылучэньня з асяродзьдзя камсамолу добрых, кваліфікаваных кадраў сьвінаводаў.

4. У галіне саўгаснага будаўніцтва прапанаваць ЦК ЛКСМ Беларусі вызначыць практычныя мерапрыемствы па выкананьні рашэньня ЦК ад 3 сакавіка 1932 г. «Аб пастаноўцы работы камсамолу ў саўгасах Збожжасаўгасаб'яднаньня і Саюзцукру» і ў якасьці першачарговых, паставіць перад камсамолам Беларусі задачы ўзмацненьня камсамольскімі кадрамі адміністрацый на-гаспадарчых зьвеньняў саўгасаў, умацаваньня камсамольскіх арганізацый саўгасаў, перабудаваўшы іх работу ў адпаведнасьці з рэарганізацыяй гаспадарчага кіраўніцтва саўгасаў.

5. ЦК абавязвае ЦК ЛКСМБ і ўсю беларускую арганізацыю прыняць рашучыя захады да ўзмацненьня марксыцка-ленінскай вучобы ў асаблівасьці сярод навічкоў і ўцягненьня іх у практычную штодзённую работу.

Ужыць захады да падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў прапагандыстаў (з разьліку 3—5 на раён), умацаваўшы іх за лік партыйна-вытрыманых, тэарытычна падрыхтаваных камсамольскіх работнікаў, арганізаваўшы курсы па іх падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы.

Сумесна з Культпропам ЦК КП(б)Б вызначыць мерапрыемствы, якія-б забясьпечылі марксыцка-ленінскую вучобу актыву.

У месячны тэрмін забясьпечыць пераклад асноўных палітпадручнікаў на беларускую, польскую і яўрэйскую мовы.

6. Адзначаючы нездавальняючы ўдзел цэлага раду зьвеньняў камсамольскай арганізацыі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве, **ЦК ПРАПАНУЕ:**

а) Асаблівую ўвагу аддаць мабілізацыі ўсёй камсамольскай арганізацыі, пэдагогаў, піянэраў, школьнікаў на хутчэйшае выкананьне рашэньня ЦК УсеКП(б) аб школе, узмацніўшы ўдзел камсамолу ў школьным будаўніцтве, забясьпечваючы школы памяшканьнем, рамонтам, інвэнтаром, школьнымі дапаможнікамі і прыладамі.

Наладзіць сыстэматычны кантроль за выхаваньнем дзяцей ў школе ў пралетарскім духу, рашуча змагаючыся з працягваньнем у школу чужой ідэалёгіі. Умацаваць камсамольскую праслойку ў складзе пэдагогаў, асабліва пачатковай і сярэдняй школы, выканаўшы ў месячны тэрмін рашэньне ЦК УсеЛКСМ аб мабілізацыі 800 камсамольцаў на пэдработу. Асаблівую ўвагу аддаць рабоце піянэр-арганізацыі ў школе, дамагаючыся палепшаньня якасьці вучобы, недапушчаючы перагрузкі дзяцей, правільна арганізуючы выходны дзень школьнікаў кіруючыся пры гэтым рашэньнем ЦК УсеЛКСМ, Наркамасьветы, і Наркамздароўя.

б) Прызнаючы нездавальняючай работу камсамолу ў стварэньні пралетарскай нацыянальнай літаратуры і яе ўкараненьні ў шырокія масы працоўных, а таксама ў пастаноўцы работы тэатру і кіно, прапанаваць ЦК ЛКСМБ забясьпечыць актыўны ўдзел камсамолу ў рабоце БелАПП'у і выхаваньні новых пралетарскіх кадраў пісьменьнікаў, арганізуючы рашучую барацьбу з пранікненьнем чужой ідэалёгіі ў літаратуру, тэатр, кіно.

в) Павысіць удзел камсамолу ў падрыхтоўцы кадраў з карэнных нацыянальнасьцяў для прамысловасьці, с.-гаспадаркі, культурнага будаўніцтва і савецкага апарату. Рашуча ўзмацніць работу камсамолу ў ВНУ, ВТНУ, тэхнікумах і рабфаках.

г) Прапанаваць ЦК ЛКСМБ у трохмесячны тэрмін сумесна з прафсаюзнымі і савецкімі арганізацыямі правесьці ў парадак хаты-чытальні, клюбы, нардамы, бібліятэкі, адпаведна абсталяваўшы іх, забясьпечыўшы кнігамі, плякатамі і да т. п. арганізаваць падрыхтоўку хатнікаў, заг. бібліятэкамі з ліку камсамольцаў.

Абавязаць райкомы ўвесьці ў практыку сыстэматычнае (прыкладна адзін раз у месяц) скліканьне раённых інструктыўных нарад загадчыкаў катчытальняў, бібліятэк і нардамоў з мэтай павышэньня іх кваліфікацыі і палепшаньня пастаноўкі работы.

д) ЦК абавязвае камсамольскую арганізацыю Беларусі ўзмацніць сваю работу сярод нацыянальных меншасьцяй, асабліва сярод яўрэйскай, польскай літоўскай моладзі, усямерна разгортваючы інтэрнацыянальнае выхаваньне.

7. **Канстатуючы нездавальняючую рэалізацыю рашэньня III пленуму ЦК УсеЛКСМ аб канкрэтным кіраўніцтве і ўказаньняў тав. Постышава, ЦК прапануе:**

Умацаваць кіруючы склад камсамольскіх работнікаў раёнаў, саўгасаў і калектываў прамысловых прадпрыемстваў.

Да веснавой сяўбы правесьці паўсямесна раённыя курсы сакратароў калгасных ячэек камсамолу.

На працягу летняга пэрыяду правесьці 2-х месячныя курсы раённага актыву пры ЦК ЛКСМБ з ахопам ня менш 200 чалавек.

Зьвярнуць асаблівую ўвагу ЦК ЛКСМБ на неабходнасьць большага прыцягненьня да кіраўніцтва ва ўсіх зьвеньнях камсамольскай арганізацыі пралетарскай моладзі і калгасьнікаў, як з ліку карэнных нацыянальнасьцяў, асабліва беларусаў, так і нацменшасьцяў.

8. Прызнаючы работу камсамольскай газэты «Чырвоная зьмена» нездавальняючай, абавязаць ЦК ЛКСМБ неадкладна ўмацаваць рэдкалегію газэты «Чырвоная зьмена».

9. Складанасьць міжнароднай абстаноўкі, небясьпека нападу на Савецкі Саюз, якая ня толькі не зьмяншаецца, але з кожным днём усё больш расьце, што асабліва пацьвярджаецца падзеямі на Далёкім Усходзе,—абавязвае ЦК ЛКСМБ і ўсю Беларускую арганізацыю камсамолу, якая знаходзіцца на важнейшым баявым вучастку, бальшавіцкімі тэмпамі ўзмацніць барацьбу за ўмацаваньне абароназдольнасьці краіны, разгарнуўшы работу Асоавіяхіму сярод рабочых, калгасьнікаў і аднаасобнікаў. Прыняць меры да арганізацыі ціраў, да навучаньня моладзі супроцьпаветранай абароны і г. д., шырока разгарнуўшы стралковы конкурс камсамолу.

10. Вызначыць суму мерапрыемстваў, якія-б забясьпечвалі ўзмацненьне дзейнасьці камсамолу ў дарожным будаўніцтве шляхам арганізацыі дапамогі рабочаю сілай, мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і арганізацыі суботнікаў.

11. ЦК УсеЛКСМ указвае ЦК ЛКСМБ і ўсёй арганізацыі камсамолу Беларусі на неабходнасьць рашучага разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі ў радах арганізацыі, накіраванай на забесьпячэньне выкананьня дырэктыў партыі, на барацьбу з праявамі ў радах арганізацыі дробна-буржуазных зьяў—склок і груповак, якія зьніжаюць баяздольнасьць арганізацыі.

Беларуская арганізацыя павінна яшчэ больш павысіць сваю клясавую пільнасьць і ўмацаваць свае рады. Надыходзячы абмен камсамольскага білета павінен паслужыць магутным сродкам мабілізацыі мас камсамолу і беспартыйнай працоўнай моладзі на барацьбу за генэральную лінію партыі, за бальшавіцкія тэмпы ажыцьцяўленьня задач гаспадарча-культурнага будаўніцтва краіны, за ўсямернае ўмацаваньне абароназдольнасьці краіны.

АБ АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫМ ПАДЗЕЛЕ КОЙДАНАЎСКАГА РАЁНУ

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

У сувязі з рэарганізацыяй Койданаўскага раёну ў нацыянальна-польскі раён, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Далучыць да Койданаўскага раёну вёскі Плоскае і Траеўку, Узьдзенскага раёну; вёску Пярхурава-Заслаўскае, Сьвярчкоўку, Сыцяфанава, Сажалку і Дубенцы, Заслаўскага раёну; вёску Антосіна, Падсасоньне, Мазуры, Халмы і Плевакі Менскага гарсавету.

2. ПЕРАДАЦЬ З КОЙДАНАЎСКАГА РАЁНУ МЕНСКАМУ ГАРСАВЕТУ вёскі: Віцькаўшчыну і Стэшкаўшчыну, Падзерка, Вільгельмава, Крупіцу, Дубінку, Сталбуновічы, Каралінку, Дубіцкую Слабаду, пасёлак Грэбенка, Еськевічы, засц. Ніцьлеўскія, Закружкі, Кругляк, Слабоду, Станкоўшчызну, Жакі, Закружкі, Купалу, Чарналескі, Волікаўшчызну, Лозкі, пас. Маліпаўка, Застарыньня, п. Дзедаўку, Чарнікі, пас. Анаполь, саўгасы Анаполь і Самалёва.

3. Зацьвердзіць наступны новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Койданаўскага раёну ў ліку 17 сельскіх саветаў у наступных межах:

1) БАБАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ у складзе вёсак Баравое, Дзяржмілеўка, Тур'якова, Альхоўка, Касілавічы, Ст. Рудзіца, пас. Вішнеўка, пас. Лучыцы, Страчаны, Барлыгі, Ваўкі, Рудзіца 1, 2, 3, п. Бакінава, Вапельня, Кастрыкаўшчына, в. Перашэвічы, Косьцевічы, Янова, Садкаўшчына, Пянкі, п. Тур'якова 1 і 2;

2) ПАЛАНЕЎСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПОЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ у складзе вёсак Паланевічы, Жывіцы, Андрэеўшчына, Шабунёўка, Папкі, Сыраватмі, Кулікі, х. Лісаўшчына, Ліўя, Асінаўка, стар. і новая;

3) НЕГАРЭЛЬСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПОЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ у складзе вёсак Чурылы, Маладкоўшчына, Каменка, Клачкі, Гарбузы, Беляўшчына, Мязнаўка,—стар. і новая, Мехаўка, Есаўка. Камароўшчына, Сходы, Коласава, Востраў, Рудні, Негарэлае, вёска Мікулічы, пас. Мікулічы, вёска Камароўшчына, Калоднікі, Лісі Вугал, Логвішча, Гарадзішча, Філіпавічы, Мілашэўшчына, Паўлаўшчына, Бабаўцы, Рэпішча, Калодзішча, Антосіна, Бярозавая Ляда, хут. Пажэжына, Старына, Мелькавічы, Клыпаўшчына, Палеснае, хут. Плятніца, Платынка, Серафімаўка, Залеглі і Ражы;

4) ЛЯХАВІЦКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПОЛЬСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ ў складзе наступных вёсак: Ляхавічы, Суднікі, хут. Паддуб'е, пас. Леніна, в. Вяселы Вугал, Ляхачоўшчына, Студзёнка, Бульнішча, Сівожанка, Рацэўшчына, Пенькавічы, Адасяўшчына, Бразеншчына, Нарэй Пісараўшчына, Бязодніца, Шатанаўшчына, Войтаўка, Глухаўшчына, Пласкае, Траеўка;

5) РУБІЛКАЎСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПОЛЬСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ у складзе наступных вёсак: Рубілкі, Бярозаўка, Ракаедаўшчына, Кірсанава, Востраў, Сакольшчына, Юнцаўшчына, Клаўцова, Даўнары, Будынкі, Янавічы, Томкавічы, Кулі, Лукашына, Каменнае, Шабунёўшчына, Уладзімірава, Чырвоны Мак, Краснае, Лайчыха, с. Шыкатовічы, Жакі, Кулакоўцы, Гарыноўка, Паллі-п'е, Дуброўка, Беліцкаўшчына, Курганьне, Баравікі, Слаўшчына, Ульянава, Кастрычнік і Сухадолы.

6) НАВАСАДЗКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПОЛЬСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ у складзе наступных вёсак: Дзямідавічы, Батурава, Атрачы, Сітнікі, Крыштафава, Марцінавічы, Хмелеўка 1 і 2, Старына, Рудоны, Грушава, Шумшчына, Балоцічы, х. Падшумшчына, Аляксееўка, Навінка, Валуціна, Канчеўшчына, Васюкі, Юшкі, Навасады, Табар, Леніна, Крукі, Круты Бераг, Станавішча, Калтань, Вызваленьне, Паўлючы, п. Зарэчча, Машніца, Маліпаўка, Вішнёўка, і Крылова.

7) ПУТЧЫНСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПОЛЬСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ у складзе вёсак: Путчына, Татаршчына, Фелікава, Чырвоны, Араты, Сакавічы, Насьледнікі, Гарупішкі, Міроны, Казлоўшчына, Шыталёўшчына, Пралетары Сьніткі, Сівужына, Перасьветаўшчына, Каменка, Ступкаўшчына, Ляхаўка, Загараны, Мітраўшчына, Пелікі, Маргі, Лінкі, Перапяткі. Антопаль, Чарвякова, Валоўнікі, Паедынкава, Юркавічы, пас. Ільліча, Шчабеты, Садоўшчына, Лінкі, Гайбуты, Сяркі, Шыркі, Дубава, Якуты, Грынькевічы, Жуйвады, Кудрыцкія, Пелікі, Граніцы, Горкі, Кавалеўцы, Марэцкія, Ясеўшчына, Галабурды, Бортнікі, Скарабагатаўшчына, Дзянісаўшчына, Мецяжы, Цюхаі, Швабаўшчына, Янава, Мілашы, Шуткова, Ласіцкаўшчына, Брагідава, Наквасы, Юхнавічы, Лесьнікоўка, Шабунёўка, Кімбары, Пельні і Чапа.

8) НАРЭЙКАЎСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПОЛЬСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ у складзе наступных вёсак: Коўшава, Шчыгельшчына, хут. Княгінічы, Мікулінскі, п. Свабода, Глушынцы, хут. Курмелева, Навасадкі, Скаробава, Свабода, Мітраўшчына, Сірматава, хут. Зубава, Вертнікі, Нарэйкі, Галышова, Востраў, М. Нарэйкі, Кулакоўцы, Бельдзюкі, Дзежкі, Дулічы, х. Дулічы, Дуброва і хут. Дуброва.

9) СТАЛІНСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПОЛЬСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ у складзе наступных вёсак: Каверляны, Шпількі, Мажэнкі, Буда, Залесьсе, Чыкі, Пацкі, Грынькова, хут. Яшава, Талкачоўшчына, Пярхурава, Плашава, Малое, Сярэдняе, Вялікае, хут. Плашава, Белякова Малое і Вялікае, хут. Казакоўшчына, Пярхурава-Заслаўскае, Стафанова, Сьвярчкова, Сажалкі, і Дубінцы.

10. НАВАСЁЛКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ у складзе наступных вёсак: Навасёлкі, Крыловічы, Прыступаўшчына, Чапля, Глыбокае, М. Навасёлкі, Ярашоўка, Баброўка, Ясюкевічы, Флярэнцінава, Латушкі і Грыцкаўшчына;

11) СТАРЫНКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ у складзе наступных вёсак: Старынкі, пас. Старынкі, Бліндажы, Ясева, хут. Драпічкі і Заросьсе, Карачуны. х. Дуброва, Целяшэвічы, пас. Аляксандрава, х. Бараўскія і хут. Заслаўка, В. Сяло, Паўлюцы, пас. Хадасы, хут. Навасадкі і Масьціішча, Русецкаўшчына.

12) ДАБРЫНЁЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ у складзе наступных вёсак: Дабрынёва, Данілавічы, Скварцы, п. Гарохаўка і М. Гарохаўка, Валяр'янава, Роркі, Дышляды, Заградзьдзе, Пахомаўшчына, хут. Зады, Унуцкаўшчына, Самадураўшчына, Углы, Узрэчча, Клімы, хут. Пазьнякі, Курганы, Захвойнікі, Глінішча, п. Данілавічы, Узрэчча, пас. Сталіна, Копаць, пас. Калініна, Талкачоўшчына, Бабкі, Мелашова, Падгор'е, Рэчкі і х. Малінка.

13) СТАНЬКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ у складзе наступных вёсак: Станькова, Каменка, Вільшчына, Лапцэвічы, Забалоцьце, Коскі, пас. Зосіна, в. Крысава, Кукшавічы, с. Станькова.

14) АЗЕРСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ у складзе наступных вёсак: Возера, Сарокаўшчына, Каралёва, Дзешчанка-Дзегцянае, Старына, Кармы, Валодзькі, Ячанка, Бязьмены, Гарадзішча, Масьціішча, Сукаўцы, Маркаўцы, Мякоты, Застарыньне, Жмакі, Басманаўка, Падазер'е, Арэхаўка, Дзегцянае, Рабінаўка, Баханы, Тамашэвічы і Дубішча.

15) КОЙДАНАЎСКІ МЕСТАЧКОВЫ САВЕТ у складзе наступных вёсак: Дзягільна, пас. Дзягільна, Макаўчыцы, Загарадзьдзе, фэрма Гай і хутар Гай, Петкавічы і Шацілы.

16) БАЙДАЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ у складзе наступных вёсак: Чарнікаўшчына, Дуброва, Кулакоўцы, Лядзікі, Байдакі, Паўелкава, Навінка, Гуршчына, Цяўлева, Машчонае, Гаеўка 1 і 2, кам. «Чырвоны Сьцяг», Лісаўшчына, Чарнікоўшчына, Грынькова, Яшава.

17) ФАНІПОЛЬ-ВЯЗЫНЬСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПОЛЬСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ з цэнтрам сельсавету ў саўгасе «Вязынь» у наступным складзе: саўгас «Вязынь-Фаніпаль», саўгас «Ружампаль-Бярэжжа» і Невялічы, вёскі Антосіна, Падсасоньне, Мазуры, Халмы, Плевакі.

СТАРШЫНЯ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

НАМ. СТАРШЫНІ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР К. БЭНЭК.

САКРАТАР ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

23 сакавіка 1932 г.
гор. МЕНСК.

Пастанова ЦКК НК РСІ

па пытаньні аб невыкананьні пастаноў СНК СССР ад 10-XII-31 г і СНК БССР ад 25-I-32 г.

адносна рэалізацыі прадукцыі вытворчасьці будматар'ялаў

Выкананьне пастаўленых партыяй і ўрадам задач у галіне ажыцьцяўленьня вялізарнага аб'ёму капітальнага будаўніцтва настойліва патрабуе захаваньня строгай плянавасьці ў справе разьмеркаваньня будматар'ялаў.

Між тым, як устаноўлена ЦКК НК РСІ, рад мясцовых устаноў і арганізацый ня выконваюць пастаноў урадавых органаў наконт здачы прадукцыі будматар'ялаў Белдзяржснабзбыту праз заключэньне з ім адпаведных дагавароў і водпуск матар'ялаў з прадпрыемстваў выключна па нарадах Белдзяржснабзбыту. Так, напрыклад:

а) Гомельскі і Віцебскі керамтрэсты, Мазырскі і Горацкі райкамбінаты, калёнія «Воля» адмаўляюцца заключаць дагавары з Белдзяржснабзбытам, а Бярэзінскі райкамбінат, апрача гэтага, займаецца недапушчальна-бюракратычнай адпіскай;

б) Гомельскі і Рагачэўскі райпрамсаюзы заключаюць дагаворы і збываюць прадукцыю на свой пагляд, ігнаруючы выкананьне нарадаў Белдзяржснабзбыту;

в) Рагачэўскі, Мсьціслаўскі і Лёзьненскі РВК замест таго, каб забясьпечыць поўнае праведзеньне ў жыцьцё пастановы СНК, самі яе парушаюць, разьмяркоўваючы прадукцыю за водпуск будматар'ялаў самастойна і пры гэтым уне сувязі з зацьверджаным урадам плянам разьмеркаваньня.

Зварочваючы ўвагу гаспадарнікаў і грамадзкасьці на ўсю недапушчальнасьць падобнага роду дзеяньняў, якія вядуць па сутнасьці да зрыву пляну будаўніцтва,—ЦКК НК РСІ пастанаўляе:

1. Вышэйпералічаным і інш. установам і арганізацыям, якія да гэтага часу ня выканалі пастановы ўраду, неадкладна заключыць з Белдзяржснабам адпаведныя дагаворы і рэалізаваць прадукцыю выключна па яго нарадах. Адказным за гэта лічыць дырэктароў прадпрыемстваў.

2. Катэгарычна папярэдзіць, што за падобныя дзейнічаньні і невыкананьне тэтай пастановы ўраду вінаватыя будуць здымацца з работы і прыцягвацца да суровай адказнасьці ў партыйным і савецкім парадку, як за зрыў пляну і разбазарваньне дэфіцытнай прадукцыі. Пры гэтым, побач з дырэктарамі прадпрыемстваў, якія вырабляюць будматар'ялы, адказнасьць за рэалізацыю прадукцыі паміма дагавароў з Белдзяржснабам і нарадаў Дзяржпляну будуць несьці таксама бухгальтары прадпрыемстваў, калі яны ня будуць сыгналізаваць перад органамі КК РСІ аб парушэньні даных дырэктыў.

3. Прапанаваць НК РСІ неадкладна расьсьледваць пералічаныя вышэй факты парушэньняў і праверыць наогул на мясцох выкананьне пастановы ўраду аб здачы прадукцыі будматар'ялаў па дагаворах і нарадах Белдзяржснабу прыцягваючы вінаватых да суровай адказнасьці.

Нам. Старшыні ЦКК КП(б)Б і Нам. Наркома РСІ БССР ГУРЭВІЧ.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

Парткалегія ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 6-IV—32 г. у г. Лепеле—РКК—РСІ будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б па разгляду наступных апэляцыйных спраў:

Цуран Л. Ф. Прыстаўка З. М. Сьвістун С. Р.—(Сенно).

Нікіценка М. К. Сяргун Я. А. Цароў А. Д. Данюш Т. В. Ядуноў А. Я. Школьнік В. М. Мароз С. М. Шыкула М. С. (Чашнікі).

Сацкевіч С. В. Кунцэвіч Т. А. Плаўнік Р. З. (Лепель).

Яўка вышэйпамянёных т. т. на ПТ ЦКК КП(б)Б абавязкова. Праезд за свой кошт.

Член ЦК ЦККК КП(б)Б Блоштэйн.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ПАПРАЎКА

У пастанове НК Працы № 16 („Савецкая Беларусь" № 74 ад 2-IV 1932 г.) зьверху ў рамцы гэтай пастановы памылкова надрукавана слова „ПРАЕКТ"

Чытаць гэтага слова ня трэба

Да пытаньня аб прызыве ў Чырвоную армію

Згодна закону аб абавязковай вайсковай службе, штогод у рады Чырвонай арміі прызываюцца грамадзяне, якія дасягнулі 21 году, для праходжаньня сапраўднай вайсковай службы на працягу ўстаноўленага законам тэрміну. Прызыў звычайна праводзіцца ўвосень пасьля сканчэньня асеньніх палявых работ. Прыкладна, у гэты-ж тэрміны з радоў Чырвонай арміі дэмабілізуюцца грамадзяне, прызваныя 2 гады назад, г. зн. адбыўшыя свой тэрмін.

Такім парадкам у бягучым годзе будзе прызваны 1910 год нараджэньня, а зьвернуцца ў доўгатэрміновы водпуск грамадзяне 1908 г.

Кампанію прызыву мы ацэньваем як падвойна палітычную, і ставім яе рад ею рад вялізарных пытаньняў.

Незасьмечваньне радоў Чырвонай арміі клясава-чужымі і сацыяльна-небясьпечнымі элемэнтамі набывае вялізарнае палітычнае значэньне, асабліва зараз пры тых міжнародных абставінах, якія абвастраюцца на фоне ўсё ўзрастаючага эканамічнага крызісу ў капіталістычных краінах. Капіталісты шукаюць выхад з яго ў вайне і ў першую чаргу ў нападзе на Савецкі саюз, які пасьпяхова будуе сацыялізм. Апошнія падзеі на Далёкім Усходзе, і выступленьне некаторых палітычных дзеячоў капіталістычных дзяржаў гавораць нам аб гэтым з усёй відавочнасьцю.

Пытаньне аб «чыстаце» Чырвонай арміі павінна прыкаваць да сябе ўвагу шырокай савецкай грамадзкасьці. У пытаньнях практычнага вырашэньня гэтай справы партыйным, камсамольскім, прафсаюзным і іншым арганізацыям павінна належаць першае месца.

Вопыты мінулых прызываў гавораць нам, што ў гэтым напрамку прафсаюзы, КСМ, ячэйкі КП(б)Б і партколектывы праробілі некаторую работу, аднак, недастатковую, а па лініі АСО проста слабую. Наглядаліся выпадкі пранікненьня ў армію чужых элемэнтаў, якія былі выяўлены ўжо ў самай арміі, дзякуючы пільнасьці і масавай рабоце палітарганаў апошняй. Трэба памятаць, што імкненьне гэтых элемэнтаў трапіць у рады Чырвонай арміі вялікае, што імі скарыстоўваюцца ўсе магчымасьці для ажыцьцяўленьня гэтай мэты. Вось чаму пытаньне вывучэньня прызыўных кантынгентаў на прадмет выяўленьня «чужакоў» і недапушчэньня іх у рады Чырвонай арміі зьяўляецца галоўным патрабаваньнем ва ўсёй падрыхтоўчай да прызыву рабоце, стрыжнём яе.

Лёзунг—«Ніводнага чужака ў Чырвоную армію» павінен атрымаць практычнае адлюстраваньне і ажыцьцяўленьне ў плянах масавай работы камсамольскіх, прафсаюзных і партыйных арганізацый. Трэба падцягнуць і Асоавіяхім як масавай арганізацыі.

Другое, ня менш важнае патрабаваньне, якое прад'яўляецца да прызыву—гэта даць Чырвонай арміі **добра пісьменнае папаўненьне.**

Гэтае патрабаваньне выцякае з неабходнасьці больш хуткага асваеньня навейшых тэхнічных сродкаў абароны, якімі Чырвоная армія з кожным годам усё больш і больш аснашчаецца, дзякуючы хуткаму росту індустрыялізацыі нашай краіны. Асвоіць тэхніку няпісьменнаму або малапісьменнаму чырвонаармейцу вельмі цяжка. Служба ў Чырвонай арміі абмежавана, таму выкраіваць час для ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці за кошт іншых дысцыплін, за кошт баявой вучобы—немагчыма.

Адсюль само сабой напрашваецца вывад—ліквідаваць няпісьменнасьць і малапісьменнасьць яшчэ да прызыву ў рады Чырвонай арміі.

Даныя прыпіскі па 1910 г. нараджэньня паказваюць, што з гэтай справай у нас ня ўсё добра.

Мясцовыя органы вайсковага кіраўніцтва, падагуліўшы вынікі, сваячасова паставілі пытаньне перад адпаведнымі арганізацыямі. Дзе-ні-дзе, як напрыклад, у Менску пры гарсавеце арганізавана нават спэцыяльная камісія, адказная за праведзеньне лікбезу сярод прызыўнікаў. Выяўлены няпісьменныя і малапісьменныя, складзены сьпісы і прад'яўлены інспэктарыяту нарасьветы, але, нажаль, гэта камісія ніводнага разу яшчэ не засядала і ніхто ня ведае ці прымацаваны няпісьменныя і малапісьменныя да лікпунктаў ці не. Ствараецца ўражаньне, што гэтай рабоце нізавыя органы НКАсьветы БССР не надаюць належнай увагі.

КСМ яшчэ ня ўключыўся ў гэту работу ў тэй ступені, у якой гэта яму належыць.

Сходы на прадпрыемствах з няпісьменнымі не праводзяцца. У клюбах, ленкутках няма нават знадворнага адбітку падрыхтоўкі да прызыву: ні адпаведнага лёзунгу, ні пляката пакуль ня відаць. Насьценгазэты таксама маўчаць.

Пакуль няма ніякай гарантыі, што сёлета ў армію ня будуць адпраўлены і няпісьменныя і малапісьменныя. Гэтага не павінна быць.

За пэрыяд, які застаўся да прызыву, ліквідацыя павінна быць праведзена цалкам. Лёзунг «Ніводнага няпісьменнага і малапісьменнага ў Чырвоную армію»—павінен быць цалкам ажыцьцёўлены. Усе магчымасьці да гэтага маюцца, трэба толькі за гэта ўзяцца як належыць.

Трэцяе патрабаваньне, якое настойліва падаецца прызыву, гэта даць Чырвонай арміі фізычна здаровае папаўненьне. Ня маючы магчымасьці ў даным артыкулу шырока выкласьці рад мерапрыемстваў па фізычным аздараўленьні прызыўных кантынгентаў па лініі саветаў фізычнай культуры, па лініі скарыстаньня прызыўнікамі водпускаў, прадастаўленых ім для гэтай мэты дамоў адпачынку і нават курортаў, скарыстаньня лячных санаторый і іншых мерапрыемстваў, накіраваных да фізычнага аздараўленьня прызываемага, — мы хочам падкрэсьліць перад органамі аховы здароўя неабходнасьць самага дакладнага вывучэньня стану здароўя прызыўніка яшчэ да ўходу ў Чырвоную армію.

Дакладнае вывучэньне і нагляд лекарскімі ўстановамі за здароўем прызыўніка дадуць магчымасьць папярэдзіць рад дэфэктаў, якія маюць уплыў на годнасьць яго, шляхам сваячасовага спыненьня працэсаў у арганізьме, якія пачаліся. Апроч таго, сыстэма папярэдняга вывучэньня здароўя палегчыць прызыўным мэдычным камісіям работу менш бесплённага адбору людзей у часе самога прызыву.

Ні для каго не сакрэт, што вызначыць ва ўсёй паўнаце стан здароўя ў адзін прыём, нават вопытным урачам, бывае часта цяжка. Таму ня радкі выпадкі, калі прызыўныя камісіі накіроўваюць ў часьці войска нягодных, а тое і зусім нягодных людзей. Вайсковыя часьці па выяўленьні такіх асоб, змушаны зварочваць іх назад. У выніку — непатрэбная страта народнай гаспадаркі.

Узрастаючая сетка лекавых устаноў, наяўнасьць на заводах і прадпрыемствах сталых мэдработнікаў, даюць нам поўную магчымасьць гэту справу забясьпечыць і правесьці не практычна. Трэба толькі зразумець неабходнасьць не і адмовіцца ад фармальнага падыходу да яе, праявіць найбольш настойлівасьці ў справе ўцягненьня саміх прызываемых і шырокага растлумачэньня сярод іх важнасьці гэтага пытаньня.

Вось тры асноўных патрабаваньні, без практычнага вырашэньня якіх ня мысьліма ажыцьцяўленьне прызыўнай кампаніі.

Трэба мабілізаваць вакол прызыву шырокую грамадзкую думку, шырока ўцягваючы ў работу перш за ўсё самых прызыўнікаў, шляхам наладжваньня зьлётаў, канфэрэнцый па прадпрыемствах, клюбах і г. д.

Застрэльшчыкам, правадніком і штурхачом у пытаньнях падрыхтоўкі прызыву павінны быць камсамол, культаддзелы прафсаюзаў, АСО і інш. пад кіраўніцтвам партячэек.

Толькі пры такіх умовах, пры сваячасовым і належным разгортваньні гэтай работы, у нас не застанецца ніякага сумненьня, што да прызыву мы падойдзем падрыхтаванымі і яго правядзем пасьпяхова.

Паплынко.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Каса з 1 г. дня	Новы гукавы мастацкі фільм Дзьве сустрэчы
КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса ад 12 гадз.	Ната Вачнадзе ў карціне Г Ю Л І
КІНО „ПРАЛЕТАРЫ"	Пат і Паташон ВАНДРОЎНІКІ

Згодна пастановы Наркамснабу СССР № 79 ад 14 II 1932 г.
усе дзяржаўныя і кааперацыйныя органы
з 1-га красавіка г. г. павінны здаваць мяхі з-пад цукру выключна Белканторы „САЮЗЦУКРАЗБЫТ"
у тэрміны вызначаныя гэтай пастановай НКСнабу
Парадак адгрузкі мяхоў і разьліку за іх устаноўлен гэтай пастановай НКСнабу.
Адпраўку мяхоў трэба адрасаваць ст. Менск, Белкантора „Саюзцукразбыт".
Дастаўляць гужам: Менск, Маскоўская, 24, склад „Саюзцукразбыт"
Белкантора «Саюзцукразбыт».

У выкананьне пастановы СНК СССР ад 13-II г. г.
Кіраўніцтва Ільнабазамі Белтэкстыльаб'яднаньня і яго базы на мясцох
ЛІКВІДУЮЦЦА
З 23 сакавіка 1932 г. працуе Ліквідацыйная Камісія К-тва Ільнабазамі (Віцебск, Арлоўская, 26)
Установы і асобы, маючыя якія-небудзь прэтэнзіі да б. Кіраўніцтва ільнабазамі павінны прад'явіць гэткія да 15-IV 1932 г.
Пасьля гэтага тэрміну ніякія прэтэнзіі ліквідкомам разглядацца ня будуць
Ліквідком

Беларускае Рэспубліканскае Аддзяленьне „Устаноўка" ЦІП
прапануе ўсім былым курсантам і інструктарам
не пазьней 6 красавіка г. г. атрымаць свае аблігацыі „5-цігодка ў 4 гады" і „3 рашаючага году"
Аблігацыі можна атрымаць ва „Устаноўцы" па Чырвонаармейскай вул. № 16, пакой № 16 з 9 гадз. раніцы да 3 гадз. дню.
Пасьля ўказанага тэрміну, аблігацыі будуць зданы ў Менскую ашчадкасу № 16, куды і зьвяртацца за атрыманьнем іх.

На падставе пастановы СНК БССР ад 29-II г. г.
БЫХАЎСКІ РАЙКААПСАЮЗ ЛІКВІДУЕЦЦА
Просім усе ўстановы і асоб, якія маюць прэтэнзіі да Быхаўскага Райкаапсаюзу, прад'явіць Ліквідкому да 5 красавіка г. г.
Пасьля гэтага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць
Ліквідком знаходзіцца пры былым Райкаапсаюзе
Ліквідком

На падставе пастановы Ельскага Райвыканкому
Ельскі Райкаапсаюз і прадстаўніцтва Белзагатжывёлы пры Райкаапсаюзе
ЛІКВІДУЕЦЦА
Установам і асобам маючым прэтэнзіі да б. Райкаапсаюзу і прадстаўніцтва Белзагатжывёла пры Райкаапсаюзе, належыць накіраваць іх у ліквідком да 10-IV 1932 г.
Пасьля паказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць
Ліквідком

Згодна пастановы СНК БССР ад 13-II 1932 г. і пастановы прэзыдыуму Капыльскага Райвыканкому ад 15 III 32 г.
КАПЫЛЬСКІ РАЙКААПСАЮЗ ЛІКВІДУЕЦЦА
Усе ўстановы і асобы, якія маюць да Капыльскага Райкаапсаюзу прэтэнзіі, павінны прад'явіць гэткія ліквідкому Райкаапсаюзу да 10 красавіка г. г.
Пасьля гэтага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць
Ліквідком

Упаўнаважаны Галоўлітбелу № 5.
Друкарня імя Сталіна

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2